Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Незыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц . . . — 70 к. „ 3 „ . . . 2 р. — к. „ 6 „ . . . 4 р. — к. „ 1 год . . . 7 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя—30 к. мясцовая . . . —10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапкавай пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапкавай наперад тэксту 1 р. — к. За радок шапкавай перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвяткныя ня 50 проц. даражэй. Зьмы тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант . . . .35 кап. За кожны дадатковы . . . .15 „ Беспрадоўн. і чырвонаармейцы за дакумант . . . .15 „ За кожны дадатковы . . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

8-мы ГОД ВЫДАЧЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 177 (2069) Субота, 6-га жніўня 1927 г.

Памятаць заўсёды.

„Мы, бальшавікі, ня буржуазныя пацыфісты, мы не хаваемся за агульнымі размовамі аб неабходнасьці ўхіліцца ад ваеннай сутычкі, якім-небудзь парадкам напярэдзіць будучае праліцьцё крыві.

Мы ведаем, што толькі перамога рабочай клясы, ліквідацыя капіталістычнай грамады пазбавіць ад пытаньня аб вайне, ваенных узброеньняў, зьнішчэньняў сотняў тысяч і міліёнаў працоўных.

У межах капіталістычнай грамады на яе сучаснай стадыі вайна зьяўляецца такою-ж неабходнасьцю, як і эксплёатацыя рабочага, падатковы рабунак селяніна, нявольніцтва ў калёніях.

Уся справа толькі ў тэрмінах, неабходнай падрыхтоўцы, мабілізацыі сіл варожых груп. Будучая вайна—гэта вайна машын і сотняў міліёнаў людзей. І тое, і другое трэба рыхтаваць. **І рыхтуюць.** Выключныя посьпехі ваеннай тэхнікі, прыстасаваньне і пашырэньне прадпрыёмстваў, якія могуць працаваць для вайны, актыўная мабілізацыя шырокіх мас цывільнага жыхарства навакол вайсковых штандараў—усё гэта факты, аб якіх штодзённа напамінаюць нашы газэты, аб якіх ведае кожны рабочы і селянін.

Сучасная падрыхтоўка вайны адрозьніваецца ад падрыхтоўкі імпэрыялістычнай вайны 1914-18 г. г. тым, **што буржуазея ведае, што будучая вайна, незалежна ад таго, кім і калі яна будзе распачата, нямінуча павінна абярнуцца ў вайну клясавую,** у вайну, якая павінна вырашыць пытаньне аб існаваньні ўлады капіталу. Іменна з гэтае прычыны зараз разгортваецца выключная па сваіх разьмерах праца «маральнай падрыхтоўкі вайны». Выкарыстоўваюцца ня толькі нармальныя мэтады ваеннай прапаганды. У ход пушчана ўся машына меншавіцкага ўплыву. Сацыял-дэмакраты сёньня адкрыта гавораць аб тым, што яны будуць заклікаць да абароны бацькаўшчыны, бо «на глебе дэмакратыі тыя, хто раней былі толькі падданымі, набылі магчымасьць дзейнічаць у якасьці вольных грамадзян» (Юліус Дэйч. «Абарона і сацыял-дэмакратыя»).

Ужо ў працягу некалькіх гадоў сусьветная сацыял-дэмакратыя штодня паўтарае, што адзіны край, які рыхтуе вайну,—гэта СССР. Левыя меншавікі тыну Баўэра, пачынаючы з Марсэльскага кангрэсу II Інтэрнацыяналу, штодзённа кажуць на розныя манеры дурную басьню аб чырвоным імпэрыялізьме, аб імкненьні савецкай дзяржавы ўзброеную сілаю распаўсюдзіць уплыў савецкай сыстэмы.

Гэта прапаганда мае толькі адну мэту—загадзя разброіць пралетарыят, паслабіць магчымасьць згуртаванага выступленьня ў барацьбе проці мілітарысцкай небясьпекі, вызваліўшы шлях капіталістычным майстрам ваенных спраў.

Меншавікі разбройваюць пралетарыят, а сусьветная буржуазея ўзбройвае і рыхтуе шматмілённыя армейскія рэзэрвы. У фашысцкіх арганізацыях усяго сьвету ўжо зараз налічваецца блізу 10 міліёнаў чалавек. Сярод іх ня мала і рабочых. Пад фірмай спартыўных, напалову навуковых і падобных ім арганізацый буржуазея падрыхтоўвае сабе вайсковыя кадры, якімі фактычна ў шмат разоў павялічваецца склад арміі.

Уладзімір Ільліч у пэрыяд падрыхтоўкі імпэрыялістычнай вайны пісаў: «Сёньня імпэрыялістычная буржуазея мілітарызуе ня толькі ўвесь народ, але і моладзь. Заўтра яна распачне, можна думаць, і мілітарызацыю жанчын». **Гэта «заўтра» сёньня ўжо настала.** У ваенных плянах мілітарыстаў жанчыне дадзена вельмі ганаровае месца. Наша суседка Польшча ужо зараз арганізавала блізка сто тысяч жанчын навакол асобных задач вайны.

Савецкі край зьяўляецца адным з самых буйных аб'ектаў імпэрыялістычных імкненьняў. Наўрад, ці трэба напамінаць, што вайна капіталістычных дзяржаў у першую чаргу будзе накіравана проці нас.

Рыхтаваца да будучай вайны, рэальна ацэньваючы свае сілы і сілы ворагаў, правільна і поўна інфармуючы шырокія працоўныя масы аб пашым становішчы, арганізоўваючы і згуртоўваючы самыя шырокія масы пралетарыяў і поўпралетарыяў у барацьбе за ўзмацненьне Савецкага Саюзу—аб гэтых задачах трэба памятаць штодзённа і кожную гадзіну.

Наша сіла ў арганізаванасьці мас, у пагалоўнай мабілізацыі ўсіх працоўных навакол галоўных задач дню. Узмацняць абароназдольнасьць СССР—зьяўляецца якраз такою задачаю.

За апошнія тыдні мы значна мабілізавалі масы навакол справы абароны. Але сказаць, што гэта праца ўжо ўвайшла ў штодзённую „практычную дзейнасьць усіх нашых арганізацый, нельга. **Мы раскачаліся.** Задача дню — **працу па мабілізацыі рабочых і сялян навакол справы абароны зрабіць плянаваю, крок за крокам яе пашыраючы, замацоўваючы дасягнутае, пераходзячы ад задач звычайных да больш складаных.**

Сако і Ванцэці пагражае кара сьмерці.

Нават буржуазныя колы супроць пакараньня сьмерцю.

НЬЮ-ЁРК, 4-8. Згодна дапушчэньня, прыгавор над Сако і Ванцэці будзе выкананы ў нядзелю, 14 жніўня. Абарона можа хадайнічаць перад вярхоўным судом аб адкладзе выкананьня прыгавору з прычыны парушэньня фэдэральнай канстытуцыі.

Друк і грамадзкія колы лічаць, што вярхоўны суд ў справу Сако і Ванцэці наўрад ці ўмяшаецца; дапушчаюць, што прыгавор будзе нязьбежна выкананы.

У рашэньні губарнатара Ульлера выявілася імкненьне санкцыянаваць сваім аўтарытэтам дзеяньні суду, якія выклікаюць усеагульнае абурэньне. Ня была нават зроблена спроба абвергнуць паказаньні сьведак абароны, высьветліць супярэчнасьці і блытаніну ў паказаньнях сьведак абвінавачаньня і г. д. У сапраўднасьці перагляд справы не дапамог высьвятленьню цёмных бакоў працэсу.

Камітэт абароны Сако і Ванцэці у Астоне апублікаваў дэклярацыю, у якой заяўляе, што паводзіны губарнатара ў часе перагляду справы Сако і Ванцэці былі нясумленныя і надзвычайна грубыя. Камітэт заклікае да ўзмацненьня кампаніі пратэсту ва ўсім сьвеце. У Злучаных Штатах ужо арганізуюцца шматлікавыя мітынгі. Намечаны таксама масавыя дэманстрацыі ў іншых краінах Амэрыкі.

«Уоркерс Парты» апублікавала дэклярацыю, у якой называе рашэньне губарнатара «вызавам, які ня мае прыкладу, і нападам на італьлянскі рабочы рух». «Уоркерс Парты» наладжвае ў Нью-Ёрку масавы мітынг у абарону Сако і Ванцэці.

Нават буржуазныя колы нездаволены рашэньнем губарнатара.

«Нью-Ёрк Таймс» піша: «Тысячы людзей убачаць, што ў справе Сако і Ванцэці ёсьць штосьці няяснае, калі выкананьне прыгавору суда адбываецца пасьля такога доўгага тэрміну».

Грамадзкія і ўрадовыя будынкі ў Вашынгтоне, Бастоне, Нью-Ёрку і іншых гарадох ахоўваюцца ўзмоцненымі нарадамі паліцыі. Прыняты меры да ўзмоцненай аховы місіі і корпусу ПАЗШ у Цэнтральнай і Паўднёвай Амэрыцы.

Муніцыпальны савет у Рыё-дэ-Жанэйро аднагодна прыняў рэзалюцыю пратэсту супроць выкананьня прыгавора над Сако і Ванцэці.

Пакараньне Сако і Ванцэці адбудзецца да 10 жніўня.

НЬЮ-ЁРК, 4-8. Губарнатар штату Масачузэтс Фулер адмовіў даравацъ віну Сако і Ванцэці.

Пакараньне сьмерцю Сако і Ванцэці на электрычным крэсьле павінна адбыцца да 10 жніўня.

Учора Сако і Ванцэці пераведзены ў камеру сьмяротных, якая знаходзіцца за некалькі крокаў ад электрычнага крэсла.

Сако галадуе ўжо 19 дзень і зморан да апошняга. Астрог, у якім зьняволены Сако і Ванцэці, вартуецца паліцэйскім кардонам. Губарнатар Фулер і судзьдзі, якія ўхвалілі прысуд па справе Сако і Ванцэці, таксама знаходзяцца пад узмоцненаю аховаю паліцэйскіх агэнтаў.

„Юманітэ" аб кангрэсе Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу.

ПАРЫЖ, 4-8. Орган францускай кампартыі «Юманітэ» зьмяшчае артыкул Брэка (пад гэтым псэўданімам хаваецца адзін з лідэраў генэральнай рады ангельскіх прафсаюзаў), прысьвечаны парыскаму кангрэсу Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу. «Інцыдэнт на кангрэсе,—піша Брэк,—не абмяжоўваецца асабістым канфліктам. Пэрсэль паставіў пытаньне аб міжнародным адзінстве прафэсыянальнага руху на правільную аснову, выкрыўшы махінацыю Жуо на кангрэсе генэральнай канфэдэрацыі працы. Жуо будзе, зразумела, падтрыманы міжнароднай буржуазеяй таксама, як яго падтрымлівае француская буржуазея. Маніфэстацыя, якая адбудзецца сёньня ўвечары (справа ідзе пра мітынг за прафсаюзнае адзінства, назначаны на сёньня ўнітарнай канфэдэрацыяй працы), выразна пакажа, што гэта палітыка амстэрдамскай верхавіны прымушае яе ўхілыцца ад канфлікту з французскімі рабочымі, якія ў згодзе з ангельскім пралетарыятам падтрымліваюць чырвоны сьцяг СССР проці прафсаюзнага нацыяналізму.

Падрыхтоўка да нападу на СССР.

Міністр вайсковых спраў Англіі выяжджае ў Індыю.

ЛЁНДАН, 4. У канцы кастрычніка ангельскі міністр вайсковых спраў выяжджае ў Індыю.

Згодна паведамленьня «Дэйлі Тэлеграф», «мэта паездкі (якая будзе мець афіцыйны характар) заключаецца ў абсьледаваньні ангельскіх войск у Індыі, у прыватнасьці—часьцей, якія знаходзяцца на паўночна-заходняй граніцы».

Газэта дабаўляе, што гэткая паездка міністра вайсковых спраў ня мае прэцэдэнтаў у гісторыі Англіі.

«Сендэй Уоркер» падкрэсьлівае, што паведамленьні аб гэтай паездцы пацьвярджаюць выкрыцьці газэт аб канцэнтрацыі ў Індыі ангельскіх войск для нападу на СССР.

Англія і Нямеччына.

БЭРЛІН, 4-8. Няспрыяючыя для Нямеччыны заявы ангельскага таварыша міністра замежных спраў Лёкер Лемпсона ў палаце вобшчын па пытаньні аб эвакуацыі Рэйнскай вобласьці, назіцыя ангельскага друку ў нядаўна абмеркаваным чытаньні аб далучэньні Аўстрыі да Нямеччыны і, нарэшце, ангельскі праэкт аб'яднаньня ранейшых нямецкіх калёній ва Усходняй Афрыцы з ангельскімі калёніямі ў адзін дамініён—усе гэтыя абставіны выклікалі ў Нямеччыне значнае пахаладжэньне да Англіі.

Учарайшае паведамленьне «Дэйлі Тэлеграф», што між саюзнымі ваеннымі экспэртамі, якія знаходзяцца ў Бэрліне, і іх урадамі адбываюцца перамовы аб нажаданасьці інспэктаваньня нямецкіх узбраёных крэпасьцяў і батарэй, разглядаецца ў нямецкіх палітычных колах, як доказ пачатку ў Англіі процінямецкай кампаніі. Гэта кампанія, водгук думкі нямецкіх палітычных колаў, выклікана абумоўленым ангельскай процісавецкай палітыкай паваротам Англіі ў бок процінямецкай палітыкі Пуанкарэ.

Тав. Чычэрын аб англа-сав. зносінах.

У гутарцы з прадстаўнікамі прэсы Чычэрын заявіў: „Вас цікавіць пытаньне аб тым, што азначае гармідар, узьняты замежным друкам у зьвязку з нібыта зробленымі савецкаму ўраду прапановамі з ангельскага боку аб адналеньні дыпляматычных зносін між СССР і Вялікабрытаніяй. На справе ніякіх прапаноў савецкі ўрад не атрымаў. Што-ж датычыць прамовы Чэмбэрлена ў палаце вобшчын 28-га ліпеня, дык яна складаецца ў першую чаргу з звычайных нападак на савецкі ўрад, якія павінны схаваць перад грамадзкаю думкаю Вялікабрытаніі тыя недапусьцімыя крокі, якія зрабіў і робіць ангельскі кансэрватыўны ўрад у адносінах да СССР (наскок у Пэкіне, наскок на Аркос, пакаённая гісторыя з „дакумантам", разрыў дыпляматычных зносін і г. д.). Апроч таго, гэта прамова сэра Остэна Чэмбэрлена мае пункт, які знарок падманвае і шырокія масы Англіі і яе, так званыя, «дзелавыя колы». Гэта пункт аб гандлі з СССР. Сэр Остэн Чэмбэрлен думае, што ва ўмовах разрыву дыпляматычных зносін і поўнай „няўпэўненасьці ў цэласьці і захованасьці савецкае маемасьці ў Англіі, гандаль можа адбывацца таксама, як і раней. Гэта, зразумела, мякка кажучы, глыбокая памылка. Ня трэба забываць, што разрыў дыпляматычных зносін і гандлёвага згавору здараўся ва ініцыятыве ангельскага ўраду. Я павінен заявіць, што да гэтага часу ніякіх ні афіцыйных, ні афіцыёзных прапаноў наконт аднаўленьня зносін з ангельскім урадам мы не атрымалі. Зразумела, калі-б ангельскі ўрад зрабіў сапраўды прапанову аб аднаўленьні дыпляматычных зносін, дык савецкі ўрад згодзен у любы момант распачаць адпаведныя перамовы і будзе дамагацца гарантый, наб начуваныя акты, як наскок на Аркос і г. д., не паўтараліся. Савецкі ўрад згодзен на кожны сапраўдны крок, які спрыяе справе спакою, бо спакой адпавядае інтарэсам самых шырокіх працоўных мас, як СССР, так і Вялікабрытаніі».

Водгукі венскіх падзей.

Фрыдрых Адлер прызнае памылку сац.-дэм.

БЭРЛІН, 2-VIII. У сваёй прамове ў Цюрыху аб венскіх падзеях сэкратар II Інтэрнацыяналу Фрыдрых Адлер спрачаўся проці зацьверджаньня, нібыта падзеі 15 ліпеня былі падрыхтаваны аўстрыйскімі камуністамі, і падтрымліваў стыхійны характар масавага выступленьня.

Характарызуючы палітыку аўстрыйскіх сацыял-дэмакратаў, Адлер заявіў, што апарат аўстрыйскай сацыял-дэмакратычнай партыі здаў. Аўстрыйская кампартыя, зазначыў Адлер, зрабіла правільна, скінуўшы зараз-жа ня сьляпа ўхвалы прысуду апраўданьня над фашыстамі, сход пратэсту; аўстрыйская сацыял-дэмакратычная партыя гэтага не зрабіла і гэта было вялікаю памылкаю. Другая памылка ў тым, што сацыял-дэмакратычная партыя ня выкарыстала існаваньня Шуцбунду. Жадаючы ўхіліцца ад абвінавачаньня, што сацыял-дэмакратычная партыя штучна ўзьнімае настроі мас, яна адмовілася ад мабілізацыі Шуцбунду і гэта адмова была рашаючаю.

Арганізацыя чорнай гвардыі.

ВЕНА, 4. У Вене адбываецца вярбоўка ў буржуазную «грамадзянскую гвардыю». Глава Тырольскага ўраду Штумпфер разьвярнуў на дзяржаўныя сродкі шырокую вярбовачную кампанію, уцягваючы сялян у арганізацыю рэакцыйнай «грамадзянскай абароны». Асабліва моцна працуюць афіцэры. Кіраўнікі «грамадзянскай абароны» складаюць «чорныя сьпісы» адказных работнікаў прафсаюзаў і сац.-дэмакратычнай партыі.

Забарона мітынгаў.

ВЕНА, 4. Паліцыя забараніла два масавыя мітынгі, якія склікала аўстрыйская кампартыя пад лёзунгам барацьбы з ваеннай небясьпекай.

Забастоўка рабочых.

ВЕНА, 4. Лік бастуючых у мэталічнай прамысловасьці Вэнгрыі перавышае 10 тысяч.

Учора на амуніцыйным і машынабудаўнічым заводзе Чэтэля, дзе рабочыя абвесьцілі італьлянскую забастоўку, забаставалі 4 тыс. рабочых газа-генэратарнага і мартэнаўскага цэхаў. Дырэкцыя абвесьціла лёкаўт усіх 7 тыс. рабочых, занятых на заводзе.

Учора абвесьцілі забастоўку 1300 гарнізоў вугольных шахт у Фюнфкірхэ пасьля адхіленьня адміністрацыяй патрабаваньня павялічыць заработную плату на 30 проц.

У Будапэшце бастуюць 20 проц. усіх рабочых гораду. Забастовачны рух распачаўся супроць волі прафсаюзнай бюракратыі.

Аўстрыйскі друк крытыкуе прамову віцэ-канцлера.

ВЕНА, 4-8. Сацыял-дэмакратычная «Арбэйтэр Цэйтунг» зьмяшчае артыкул пад загалоўкам: «Плёткі Хартлеба зробяць тысячы рабочых беспрацоўнымі». Артыкул перадае ход доўгіх перамоў, якія праводзіў венскі муніцыпалітэт, што імкнуўся павялічыць нагрузку венскай прамысловасьці праз атрыманьне савецкіх заказаў і адзначае, што гэтыя заказы забясьпечылі-б працаю ня менш 10 тысяч беспрацоўных у працягу году. Газэта падчырджае, што Ленгіэль і Рапапорт прыехалі ў Вену імэнна для гэтых перамоў. Газэта востра нападае на Хартлеба і заяўляе, што аўстрыйскі ўрад замест таго, каб стварацъ канфлікт павінен быў-бы прасіць прабачэньня ў Ленгіэля і Рапапорта, якія маюць дыпляматычныя пашпарты.

Галоўныя перамовы між венскім муніцыпалітэтам і савецкім урадам, піша газэта, хутка скончацца; няўжо ўсё гэта павінна зьнішчыцца толькі таму, што г-н Хартлеб ня ведае, аб чым гаворыць? Няўжо мы павінны за плёткі недальнабачнага міністра разьлічвацца ростам беспрацоўя. Газэта заяўляе, што аўстрыйскі ўрад абавязан поўнасьцю здаволіць СССР, каб ухіліцца ад зрыву плянаў венскага муніцыпалітэту, якія прадугледжваюць павялічэньне аўстрыйскага вывазу ў СССР. Хартлеб, кажа нарэшце газэта, зрабіў, як сельскі стараста, які нічога не разумее аб значэньні міжнародных адносін для народнай гаспадаркі Аўстрыі. У пытаньнях міжнароднага характару ён трымае сябе, як слон у пасуднай краме».

Камэдыя ў Жэнэве скончылася.

Канфэрэнцыя адкладзена.

ЬЭРЛІН, 4. На сёньнешнім вячэрнім пасяджэньні жэнэўскай канфэрэнцыі пастаноўлена адкласьці яе па нявызначаны тэрмін.

Брыджэй (Англія) зазначыў, што амэрыканская дэлегацыя адхіліла ангельскія прапановы па ўсіх асноўных пытаньнях

Саіто (Японія) выказаў глыбокае расчараваньне з поводу таго, што між Англіяй і Амэрыкай засталіся яўна невырашымыя разнагалосьсі.

Ібсон (Амэрыка) зазначыў, што адзіным вынікам прыняцьця ангельскіх прапаноў была-б магчымасьць для Англіі рабіць усё, што ей спадабаецца, а Амэрыка была-б абмяжована ў пабудаваньні ўсіх ваенных суднаў, у якіх яна больш усяго мае патрэбу.

Пасьля выступленьня кіраўнікоў дэлегацый Ібсон агаласіў агульную дэклярацыю, у якой зазначаецца, што канфэрэнцыя нацярпела няўдачу з прычыны таго, што не ўдалося дасягнуць згоды між Англіяй і Амэрыкай. З поводу гэтага дэлегаты лепшым выхадам са становішча знашлі адклад канфэрэнцыі, прадаставіўшы праблему марскіх разброеньняў сваім урадам.

Японія імкнецца „папраўіць справу".

ЛЁНДАН, 4-7. Сёньня на двух пасяджэньнях гэбінэту абмяркоўвалася японская кампрамісная прапанова, высунутая з мэтаю ўхіліцца ад зрыву жэнэўскай канфэрэнцыі па абмежаваньні марскіх узброеньняў.

Пасьля пасяджэньня ангельскай дэлегацыі ў Жэневе былі перададзены праз тэлеграф падрабязныя інструкцыі.

Весткі з Кітаю.

Не спадабалася.

ШАНХАЙ, 4-7. Ангельскі афіцыёз у Шанхаі «Норт Чайна Дэйлі Ньюс» адзначае спробы нанкінскага ўраду прыдушыць «вольны, незалежны друк» (як паведамлялася, нанкінскі ўрад забараніў кітайскай пошце перасылаць «Норт Чайна Дэйлі Ньюс»), Газэта заяўляе, што нанкінскі ўрад парушае пастановы вашынгтонскай канфэрэнцыі аб перадачы пошты пад загад кітайскай ўлады і што заява ўраду супярэчыць міжнароднай паштовай канвэнцыі. Зачыненьне Далёка-Усходняга банку, піша газэта, як думаюць, таксама было ўчынена ня ў меру прыхільнымі чыноўнікамі, якія перавысілі свае правы ў барацьбе з чужаземнымі ўстановамі. (Трэба адзначыць, што ліпеня некалькі дзён назад газэта поўнасьцю ўхваляла загад аб зачыненьні Далёка Усходняга банку).

Дэзарганізацыя ў войсках уханскага ўраду.

ШАНХАЙ, 4-8. Перадаюць, што камандзір 28 дывізіі ўханскага ўраду Іе-Цін, войска якога знаходзілася ў Нанчане, адмовіўся падначальвацца Чан-Фа-Гуэю (камандуючы 4 «жалезнай» арміяй уханскага ўраду). Ён перарваў чыгуначны рух каля Дэйану і разбройў часьць войска Чу-Тэй-Бэ.

Карэспандэнт агенцтва Тохо дадае, што Чан-Фа-Гуэй у апошні час выступае проці прафэсыянальных саюзаў і камуністаў. Ча-Фа-Гуэй распусьціў ужо некалькі палітаддзелаў сваёй арміі і зачыніў адну газэту.

Камісія па абароне інтарэсаў рабочых.

ШАНХАЙ, 4-8. Шанхайская ўлада агаласіла пастанову аб арганізацыі арбітражнай камісіі. «Камісія, зазначана ў пастанове,—арганізавана для абароны інтарэсаў рабочых і іх эканамічнага дабрабыту. Камісія павінна таксама служыць пасрэдніцкім органам між прадпрыёмцамі і рабочымі ў інтарэсах дабрабыту ўсёй грамады. У склад камісіі ўваходзяць: прадстаўнік гарадзкога камітэту Гаміндану, два прадстаўнікі з месц, пяць прадстаўнікоў ад прафэсыянальных саюзаў» (арганізаваных Чан-Кай-Шы), пяць прадстаўнікоў купецкіх арганізацый. Пастановы камісіі павінны быць пагоджаны з правінцыйным урадам».

Арыштаваны студэнты ўнівэрсытэту Сун-Ят-сэна.

ШАНХАЙ, 4-7. Арыштаваныя гэтымі днямі на прыплыўшым з Уладывастоку параходзе 11 студэнтаў унівэрсытэту Сун Ят-сэна пасланы для суду ў Нанкін.

ВАКОЛ НАФТАВАГА КАНФЛІКТУ.

Італьлянскі друк аб нафтавым канфлікце.

РЫМ, 4-8. «Джорналь Д'Італія» зьмяшчае вялікі артыкул свайго бэрлінскага карэспандэнта, прысьвечаны канфлікту між англа-галяндзкім нафтавым трэстам «Рояль Дэтэ Шэль» і «Стандарт Ойль і К-о» у Нью-Ёрку. Адзначаючы небясьпеку для Англіі прыходу савецкай нафты ва ўсходнюю і паўднёвую Азію пры дапамозе амэрыканскага капіталу, карэспандэнт прадбачыць далейшае абвостраньне гэтага канфлікту. Што-ж датычыць Італіі,—піша газэта,—дык яна павінна з гэтай барацьбы зразумець, што ідэалёгічная незамірнасьць не павінна перашкаджаць італа-савецкаму эканамічнаму супрацоўніцтву. Італія павінна ў гэтых адносінах выкоўваць рэалістычную і рашучую палітыку Злучаных Штатаў.

Савецкая нафта не дае спакою Дотэрдынгу.

НЬЮ-ЁРК, 4. «Нью-Ёрк Амэрыкан» публікуе тэлеграму Дотэрдынга, у якой апошні пагражае выцесьніць амэрыканскія нафтавыя кампаніі з Індыі—рэпрэсія за пакупку савецкае нафты—і дае дырэктывы амэрыканскаму аддзяленьню «Рояль Детч Шэлл» з поводу кампаніі ў друку супроць «Стандарт Ойль».

ВЕСТКІ З УСЯГО СЬВЕТУ.

Савецка-латвійскі ўгавор перададзен на зацьверджаньне сойму.

РЫГА, 4-8. Урад перадаў савецка-латвійскі гандлёвы ўгавор на зацьверджаньне сойму.

Дорыё даваць паказаньні адмовіўся.

ПАРЫЖ, 4-7. Дорыё адмовіўся адказваць на запытаньні сьледавацеля. Аб прычынах сваёй адмовы Дорыё піша: «Пастанова аб маім арышце і ўзьняцьце проці мяне судовага праследваньня зьяўляюцца незаконнымі, паколькі парляманцкая камісія яшчэ не ўхваліла пастановы пазбавіць мяне дэпутацкай недатыкальнасьці. З другога боку пытаньне аб маім падарожжы ў Кітай уключана ў парадак дню палаты дэпутатаў. Міністр унутраных спраў публічна выказаў жаданьне асабіста адказаць па мае тлумачэньні ў парляманце. Калі ўрад цяпер зьмяніў свой пункт гледжаньня і хоча зацерці справу, дык я ня маю намеру быць супольнікам у гэтым манэўры.

Нямецкая рабочая дэлегацыя рыхтуецца ў СССР к 10-й гадавіне Кастрычнікавай рэвалюцыі.

БЭРЛІН, 4-8. Камітэт адзінства (арганізаваны ўдзельнікамі 1-ай і 2-ой нямецкіх рабочых дэлегацый у СССР) зьвярнуўся ў прэзыдыум УЦСПС з заявай аб тым, што сярод нямецкіх рабочых існуе шырокі рух на карысьць пасылкі новай дэлегацыі ў СССР к 10-й гадавіне Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Ад УЦСПС быў зараз-жа атрыман адказ, які запрашае нямецкую дэлегацыю прыехаць у СССР к 10-й гадавіне Кастрычнікавай рэвалюцыі.

У сувязі з гэтым камітэт адзінства пачаў арганізаваць пасылку дэлегацыі.

У Польшчы.

Калі будзе скліканы польскі сойм?

На адбыўшайся ў маршалка сойму нарадзе прадстаўнікоў соймавых клюбаў па пытаньні аб скліканьні сэсіі сойму пастаноўлена падаць заяву аб ⅓ часьці паслоў аб скліканьні сойму ў першых чыслах верасьня.

Перад сэсіяй сойму адбудзецца яшчэ адна нарада па пытаньні аб праграме сэсіі.

Беларускія і украінскія сельсаюзьнікі ў маршалка сойму.

2 ліпеня г. г., як паведамляе „Gazeta Warszawska" (№ 211), маршалак сойму прыняў паасобку прадстаўнікоў славянскіх меншасьцяў: беларуса Ярэміча і ўкраінцаў Васынчука і Казіцкага.

У Зах. Беларусі.

Міністр Медзінскі ў Вільні.

Міністр пошт і тэлеграфаў Медзінскі «адпачывае» ў Вільні і, як піша «Słowo», запрошан на паляваньне да маёнтку гр. Пшэздзецкіх. Пажадаем яму ў гэтай справе больш посьпеху, як у справах міністэрскіх і асьцерагаем, каб ня здарыўся з ім выпадак, які адбыўся гэтымі днямі з адным польскім абшарнікам, які на паляваньні, замест качкі, забіў свайго повара.

Пачатак працы новай рады.

Новая віленская рада з 2 ліпеня пачала працаваць. Улада над горадам перайшла ў рукі новай рады. Адначасна адбылося першае пасяджэньне новай рады.

Выбары ў Белавескую валасную раду.

Нядаўна адбыліся выбары у Белавескую валасную раду. Фігуравала 2 сьпіскі: № 1 беларускі і № 2 польскі, у які ўваходзілі выбарцы выключна толькі з Гайнаўкі, сядзібы «генэрала» Балаховіча. Усе іх забегі і клопаты, каб перамагчы беларускі сьпісак, ня мелі блізу ніякіх уплываў. Сяляне-беларусы правялі 12 сваіх кандыдатаў, а яны толькі трох.

У Літве.

Лётная катастрофа.

Літоўскі вайсковы апарат «Гальбстэтэр», якім кіраваў паручык Машкус, у ваколіцы Вясёлага-Двара, з вышыні ў 450 м., упаў і разьбіўся.

Пілот і яго таварыш пар. Лсончык цяжка паранены.

Літоўскі гандлёвы флёт.

Экспэдыцыйна-гандлярскае т-ва «Сандэліс» падало ўраду мэмарандум па пытаньні аб заснаваньні літоўскага гандлёвага флёту. Па думцы таварыства, заснаваньне гандлёвага флёту падняло-б дабрабыт краю.

Будаваньне унівэрсытэту.

Літоўскі ўрад пастанавіў далей будаваць унівэрсытэцкі гмах на Горнай Фрэйдзе.

Тэрмін пабудоўкі перанесен на 1 год.

За дзень.

Суд звар'яцеўшага капіталу.

Сако і Ванцэці будуць расстрэлены. Гэтак паведамляе тэлеграф.

Губарнатар штата Масачузэтс Фулер адмовіўся скасаваць пастанову суду аб забойстве гэтых двух пралетарыяў за тое, што нейкія бандыты ўчынілі нейкі напад і забілі нейкіх штрэйкбрэхераў, якія зрывалі забастоўку рабочых. Няма нават у Амэрыцы ніводнага грамадзяніна, якія-б верылі, што Сако і Ванцэці зьяўляюцца сапраўднымі забойцамі. Больш таго, знайшоўся сапраўдны забойца, які сазнаўся ў тым, што ён забіў гэтых штрэйкбрэхераў.

Буржуазнаму суду абавязкова трэба было засудзіць Сако і Ванцэці, каб гэтым самым дэманстраваць сваю рэакцыйную сілу, каб яшчэ раз пацьвердзіць, што буржуазны суд існуе для таго, каб абараняць інтарэсы капіталу.

Больш 5 год перадавыя рэвалюцыянэры ўсяго сьвету змагаліся за жыцьцё гэтых ні ў чым непавінных рабочых. Масавыя дэманстрацыі пратэсту, якія адбыліся ў працягу апошняга месяца ў Францыі, Амэрыцы, Нямеччыне і інш. краінах, патрабавалі, каб Сако і Ванцэці былі вызвалены.

Перад буржуазным судом паўстала пытаньне: Вызваліць Сако і Ванцэці і гэтым самым распісацца ў сваёй рэакцыйнасьці, неправільнасьці і крывахцівасьці да рабочых, альбо пасадзіць іх на электрычны стул і гэтым самым дэманстраваць сваю цьвёрдакаменнасьць і цьвёрдалобасьць. Губарнатар Фулер пайшоў па другім шляху.

Прысуд да расстрэлу Сако і Ванцэці ў працягу 5 год хвалявае рабочыя масы, якія патрабавалі іх вызваленьня. Зараз новая пастанова губарнатара яшчэ больш узварушыць пралетарыят усяго сьвету. Суд «дэмакратычнай» Амэрыкі паказаў свой сапраўдны твар. Ён паказаў, што амэрыканская дэмакратыя вельмі мала розьніцца ад італьлянскага і польскага фашызму.

Звар'яцеўшая буржуазея хоча крыві. Пушчаньнем крыві яны думаюць выратаваць сваё вельмі хісткае становішча. Вы хочаце крыві, пралетарыят вам яе пакажа, але тады запяеце іначай.

Цьвярозыя думкі.

Узварушыліся обэр-паліцэйскія і обэр-фашысты. Як-жа гэта можна? У Вене паўстаньне. Рабочыя спалілі будынак судовых ўстаноў. Рабочыя прагналі паліцыю. Рабочыя абвясьцілі ўсеагульную забастоўку. Рабочыя творацъ сацыяльную рэвалюцыю, а тут ніякіх „агэнтаў Масквы", ніякіх бальшавікоў няма?

Што-ж скажа цівілізаваная Эўропа? Што-ж скажуць грошадаўцы ангельскія і іншыя? Трэба іх знайсьці, а як ня знойдуцца—іх трэба будзе стварыць.

Аўстрыя перажывае вялікае беспрацоўе. Аўстрыя коціцца па шляху эканамічнай катастрофы. Яна шукае рынкаў, якія-б ёй дазволілі хоць крыху пашырыць сваю прамысловасьць.

СССР патрэбны тавары. У Аўстрыі ёсьць фабрыкі, якія нам могуць даць патрэбныя тавары. Нашае гандлёвае прадстаўніцтва ў Бэрліне пасылае сваіх прадстаўнікоў Ленгіэля і Рапапорта весьці перамовы з венскім муніцыпалітэтам, каб там закупіць неабходныя тавары.

І вось прыехаўшыя таварышы (выпадкова якраз у часе паўстаньня) арыштоўваюцца паліцыяй, як нібы арганізатары гэтага паўстаньня. Нават сацыял-душыцелі Баўэр і інш. прымушаны былі сазнацца ў стыхійнасьці паўстаньня і яны шмат разоў падкрэсьлівалі, што камуністы Аўстрыі, тым больш савецкія гандлёвыя прадстаўнікі ніякага ўдзелу ў арганізацыі паўстаньня ня прымалі. Але раз віцэ-канцлеру Хартлебу патрэбны былі «маскоўскія агэнты», тады чаму-ж не арыштоўваць Ленгіэля і Рапапорта.

Аўстрыйская газэта «Арбэйтэр Цайтунг» па гэтаму выпадку піша:

«Няўжо-ж мы павінны за хлусьню ня зусім далёкага міністру паплаціцца ростам беспрацоўя. Аўстрыйскі ўрад павінен даць поўнае задаволеньне СССР, каб уніknуць зрыву плану венскага муніцыпалітэту, які прадугледжвае ўзмацненьне аўстрыйскага экспорту ў СССР».

Мы зусім згодны з гэтай газэтай, што ў пытаньнях міжнароднага характару Хартлеб вядзе сябе як «слон у пасуднай краме», але калі гэта датычыцца СССР, мы маем права зусім рашуча напомніць гэтым панам, што мы

Маленькі фэльетон.

ЗАМЕСТ „САНАЦЫІ“—АСЭНІЗАЦЫЯ.

Слово «абоз» ужываецца ў Польшчы не для абазначэньня шэрагу фурманак, якія вязуць на вазох, скажам, мяхі з мукою або штось-ці ў бочках, а для абазначэньня палітычных згуртаваньняў. Напрыклад, кажуць—абоз Пілсудзкага і г. д.

Можна таксама сказаць: «санацыйны абоз», пад якім разумеюць тых, хто разам з Пілсудзкім проводзіць у Польшчы так званую пасьлямаёвую санацыю (аздараўленьне). Нашы заходнія браты, наглядаючы скоса на гэты «санацыйны абоз» пілсудчыкаў і на яго працу скажуць, што ад яго ня добра пахне і што куды больш трапным было-б называць яго «асэнізацыйным абозам».

Чаму?

А таму, кажуць, што ўсе гэтыя «санатары»: асаднікі, паліцыя шпікі, засьцянковыя шэрпні, падпалкі, паны, абшарнікі, ксяндзы, якія панаехалі ў Зах. Беларусь, робяць такі «санацыйны смуод», што хоць ты ўцякай.

І дзіўная рэч! Тады як ад свайго «дабра», вывезенага на поле, усе росьце аж да неба, польскае «дабро» выналівае і сушыць беларускія палі і выклікае ў беларускім носе, горле і лёгкіх страшэнны кашаль і зуд.

Асабліва ад асадніцкага дабра. Калі пан Пілсудзкі стварыў асадніцтва на Ўсходніх крэсах, дык ен казаў: трэба ўзмацніць на крэсах уплывы вышэйшай польскай культуры і прывіць яе «цёмнай» беларускай вёсцы.

Але прайшло трохі часу і аказалася, як прызнае нават абшарніцкае «Slowo», што асаднікі зусім і ня зьбіраліся займацца шыраньнем «санацыйнай культуры», што з гаспадарчага боку польскае асадніцтва на беларускіх землях збанкрутавала, што «культурнае» жыцьцё асаднікаў прадстаўляе проста нейкае гніцьцё, расклад.

Аказалася, што польскія асаднікі прадстаўляюць і нацыянальна і сацыяльна чужую і варожую для беларускіх масаў сілу, ад якой беларускае сялянства адгарадзілася мурам.

Пры такіх варунках польскія асаднікі апынуліся вонках жыцьця беларускай вёскі. Яны і жывуць супольным жыцьцём толькі з тою „асэнізацыйнай“ польшчынай, якую прадстаўляюць польскія паліцыянты, настаўнікі рэстараншчыкі і дробныя панкі.

Польскае асадніцтва, па нявыказанай думцы п. Пілсудзкага, зьяўляецца ў Зах. Беларусі ваенна-паліцэйскай рэзэрвай, параскіданай па ўсім краі ўваружанай з'арганізаванай сілай у дапамогу польскай арміі і адміністрацыі «на кожную патрэбу».

Вось як выглядае «санацыйная, культурная місія» польскага асадніцтва на землях Зах. Беларусі.

Замест «санацыі» на справе вышла «асэнізацыя».

Замежны.

Польска-літоўскія спрэчкі.

Уся польская прэса, а пераважна віленская заўсёды зьмяшчала на сваіх шпальтах многа артыкулаў і заметак, якія закранаюць пытаньне аб узаемадносінах паміж Літвой і Польшчай. Асабліва-ж многа стала гаварыць польская прэса аб Літве ў апошнія часы.

Справа ідзе аб магчымасьці польска-літоўскай згоды. Фашыстаўскі перавапрот ў Літве ўзбудзіў сярод некаторых палітычных колаў Польшчы новыя надзеі на магчымасьць паразуменьня. І вось... пашлі пісаць...

З боку ліцьвінаў сталі адказваць на гэтую пісаніну.

Разумеецца, новага ні з аднаго, ні з другога боку нічога ня сказана. Але, адна спроба пачаць нанова размову на старую тэму ужо аб нечым гаворыць. Штось-ці такое ёсьць; або нашчупваецца грунт для чагосьці; ці мо' хто за сьпіною Польшчы і Літвы абмяркоўвае свае палітычныя магчымасьці?..

Ясна, што «ваеннае становішча» паміж Літвой і Польшчай, у якім яны цянер афіцыйна знаходзяцца, хоць і не ваююць, стварае для палітычных камбінатараў варожых да нас дзяржаў, а перад усім—Англіі, непажаданую сітуацыю ў выпадку патрэбы стварэньня адзінага фронту проці нас.

Пры розных палітычных камбінацыях на гэтую тэму Літва, такая, здаецца, маленькая—адыгрывае, дзякуючы свайму геаграфічнаму палажэньню і сваім палітычным і тэрытарыяльным вымаганьням, вельмі значную ролю: без яе ідэя адзінага фронту ад Балтыцкага да Чорнага мора ня можа быць зьдзейсьнена.

Апрача таго, дзякуючы «літоўскай упартасьці», Польшча ніяк ня можа дабіцца пашырэньня і паглыбленьня сваіх уплываў на балтыцкія дзяржавы: Латвію і Эстонію. Гэтым лімітрофам, якія фактычна ня маюць з-за чаго з намі ваяваць, зусім ня выгодна ўваходзіць у палітычны ці ваенны саюз з Польшчай, асабліва, калі паміж імі і Польшчай клінам урэзваецца Літва.

Вось чаму польскія палітыкі з ідэяламі «ад мора да мора», ня гледзячы на безнадзейнасьць уцягнуць Літву ў арбіту сваіх плянаў, усё-ж у соты раз прабуюць спакусіць Літву «небёснымі мігдалямі», нічога ёй не даючы па сутнасьці.

Разам з тым, як бы не знарок у Літву прыляджае французкі генерал Ле-Рэнд, які, як прамільнула ў газэтах, меў на мэце схіліць літоўскі ўрад да залагоджаньня сваіх адносін да Польшчы...

А з Літвы у Польшчу прыехаў праф. Гэрбачэўскі, якога польская прэса называе ліцьвіном, але прозьвішча яго, як мы можам бачыць, чыста славянскае. Гэты «ліцьвін», апынуўшыся ў Польшчы, стаў моцна крытыкаваць літоўскую палітыку адносна Польшчы і выхваляць палякаў. «Сэрца Варшавы, на яго словах, палае такім замілаваньнем да Літвы» і г. д.

Мы ня будзем спыняцца на развараньнях гэтага «ліцьвіна», якога выкарыстоўвае польская прэса, а наглядзімо, як рэагус на яго дзейнасьць літоўская прэса.

У № 163 газэты «Летува» мы знаходзім такія радкі:

«Прэса, а за ёю і польскае грамадзянства адразу выабразілі, што п. Гэрбачэўскі карыстаецца ў Літве агромністымі ўплывамі, зьяўляецца вялікім палітыкам і найбліжэйшым дарадчыкам літоўскіх дзяржаўных дзеячоў. П. Г., відаць, ня меў намеру грацы ролі Хлестакова з камэдыі Гогаля «Рэвізор». Аднак, калі ў Польшчы яго прынялі за такога, п. Г. удзяліў польскай прэсе сапраўды хлестакоўскіх выведаў».

І далей:

«Польская прэса інфармуецца ў розных хлестаковых, якія паўтараюць заезджаную песеньку аб «нямецкай і маскоўскай інтрызе ў Коўні».

«Летува»—орган, блізкі да ўрадавых сфэр і таму яго рэпліка на заявы Гэрбачэўскага ў польскай прэсе можа быць прынята намі пад увагу, як адпавядаючая настроям урадавых сфэр Літвы. Так, як мы бачым, ацэньвае літоўская прэса сучасны момант і напыткі схіліць яе палітыку ў русло палітыкі польскай.

Другая літоўская газэта «Рытас» у артыкуле: «Ня трэба сябе ашукваць». (№ 163) закранае ўсё тое-ж пытаньне аб Вільні і Віленшчыне і хоча пераканаць Польшчу, што для яе Вільня ў выпадку вайны зьяўляецца пунктам малазначным, такім, як, напрыклад—Ваўкавыск, бо «дзяржава, якая мае меншую збройную сілу, чым праціўнік, павінна імкнуцца да таго, каб абшар ваенных апэрацый быў як мага вужэйшым».

У далейшым «Рытас» хоча пераканаць Польшчу, што ёй лепш было-б дабрахоць зрачыся Вільні на карысьць Літвы. Але на гэта «Рытас» не спадзяецца, бо нават

«Сацыялістычны польскі «Robotnik» здаўна ўжо дамагаецца «сканчэньня з Літоўскай дзяржавай», відаць—дарогай ліквідацыі гэтай апошняй».

Урэшце «Рытас» выказвае такую думку:

«Літва можа спадзявацца на зварот Вільні скарэй дарогай належнага выкарыстаньня напружанай палітычнай сітуацыі ў Эўропе, ніж дарогаю чаканьня моманту, калі Польшча дабрахоць згодзіцца вярнуць Вільню Літве».

Вывад, які можна зрабіць з усёй гэтай літаўска-польскай пісаніны, больш-менш такі:

Польшча ўсё з большаю нецярпліваасьцю хоча дабіцца ад Літвы той ці іншай з ёю згоды. Каб Літва згадзілася на палітычнае супрацоўніцтва з Польшчай, то, быць можа, Польшча і зраклася-б на карысьць Літвы Вільні і Віленшчыны. Але, па перакананьні літоўскіх палітыкаў, такі курс літоўска-польскіх узаемаадносін закабаліў-бы Літву і пазбавіў-бы яе палітычнай самастойнасьці. На гэта Літва ня можа пайсьці, а таму і ўсе гутаркі астаюцца толькі гутаркамі.

М. К.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

Прызыў на вайсковую службу грамадзян нараджэньня 1905 г.

МАСКВА. Апублікаваны загад Ваеннага Савету СССР аб прызыве грамадзян нараджэньня 1905 году на абавязковую вайсковую службу.

«Прызыў на абавязковую вайсковую службу грамадзян 1905 г. нараджэньня па ўсёй тэрыторыі СССР», гаворыцца ў загадзе, «правесьці ў пэрыяд між 1 верасьня і 1 лістапада г. г. Дакладныя тэрміны прызыву для кожнага вокругу—устанавіць Рэвваенсаветам ваенных вокругаў. Адначасова з прызывам грамадзян нараджэйшыхся ў 1905 г., прызываць а) 1903-904 г. г. нараджэньня, якім скончыліся адсрочкі па хворасьці недарослaсьці, і б) грамадзян, якім скончыліся адсрочкі, прадастаўленыя пры ранейшых прызывах па асьвеце ці іншых прычынах».

На Ніжагародзкім кірмашы.

НІЖНІ-НОЎГАРАД, 4-8. Тысячы людзей штодня праходзяць праз выстаўку «Госторга» на Ніжагародзкім кірмашы.

У мастацка пабудаваным павільёне выстаўлены скуры і скуркі зьвяроў, пачынаючы з баброў, коштам у 3 тыс. рублёў за скурку і канчаючы малюсенькімі скуркамі кратоў і сусьлікаў.

Згодна апошніх вестак, заграніца пачала вельмі цікавіцца скуркамі кратоў і сусьлікаў, і ў наступным годзе іх будзе вывезена на замежны рынак 10 млн. штук.

Ёсьць таксама спрос на скуркі вадзяных пацукоў. Сёлета іх было здабыта 800 тыс. штук, а плян наступнага году прадугледжвае рэалізацыю 3 млн. гэтых скурак.

Выстаўка пушніны „Госторга“ на Ніжагародзкім кірмашы ня толькі знаёміць з відамі пушнога экспорту, а і дэманструе выраб скурак, што вельмі важна для прыяжджаючых на выстаўку паляўнічых.

Абурэньне працоўных Савецкага Саюзу супроць прыгавору над Сако і Ванцэці.

МАСКВА, 5. Прыгавор над Сако і Ванцэці выклікаў глыбокае абурэньне працоўных Савецкага Саюзу.

У ЦК МОПР'у СССР нясупынна паступаюць рэзалюцыі і тэлеграмы ад грамадзкіх арганізацый СССР з пратэстам супроць падрыхтаванай кары сьмерці Сако і Ванцэці.

Удзельнікі Парыскае Камуны Антуан Го і Густаў Інар, якія знаходзяцца ў Маскве, прыслалі ў Выканком МОПР'у ліст з пратэстам супроць прыгавору над Сако і Ванцэці,

Адозва Мопр'у наконт прысуду Сако і Ванцэці.

МАСКВА, 4-8. Агалошана адозва выканкому Мопр'у наконт зацьверджаньня сьмяротнага прысуду над Сако і Ванцэці.

«Сьмяротны прысуд на Сако і Ванцэці,—зазначана ў адозве,— зацьверджан. 10 жніўня надыходзіць пакараньне сьмерцю 2 нявінаватых. Рыхтуецца халоднае забойства. 6 гадоў Сако і Ванцэці пакутуюць у астрозе, 6 гадоў штодня выкрываецца беспадстаўнасьць абвінавачаньня проці іх, 6 гадоў даказалі іх невінаватасьць. 6 гадоў увесь сьвет, усе працоўныя, усе сумленныя ворагі клясавай юстыцыі, капіталы пратэстуюць проці гэтага нячуванага забойства. 6 гадоў крывасмоктная зграя цынічных прадстаўнікоў буржуазнай клясавай юстыцыі рыхтуе кару для іх, адзінае злачынства якіх у тым, што яны змагаліся за лепшую будучыну чалавецтва. Зараз каты хочуць учыніць сваю крывавую справу—яны зьбіраюцца забіць свае ахвяры. Працоўныя ўсіх краёў і вы, інтэлігэнцыя, і ўсе, у кім жыве пачуцьцё справядлівасьці! Пратэстуйце! Не дапушчайце крывавай расправы катаў! Выходзьце на дэманстрацыі! Пасылайце дэлегацыі. Хто не пратэстуе проці гэтага забойства, якое зьяўляецца вызавам усяму сьвету, вызавам усім тым, хто 6 гадоў выступае за справу Сако і Ванцэці, той ня выконвае свайго абавязку. Хто ня зробіць усяго, каб перашкодзіць забойству, той палегчыць працу забойцам. Рабочыя, інтэлігэнцыя ўсіх краёў, не дапусьціце забойства Сако і Ванцэці. Выканком Мопр'у».

Памёр стары бальшавік.

МАСКВА, 4-8. Пасьля доўгай хваробы 4 жніўня памёр сэкратар ЦК саюзу тэкстыльшчыкаў Лебедзеў. У партыі бальшавікоў ён працаваў з 1903 г., у прафэсыянальным руху з 1907 г. і быў адным з арганізатараў саюзу тэкстыльшчыкаў. Па прафэсіі Лебедзеў—рабочы-ткач. Нябошчыку—45 гадоў.

Амэрыканская рабочая дэлегацыя раскажа сваім таварышом праўду аб СССР.

ЛЕНІНГРАД. Экскурсія амэрыканскіх рабочых перад выездам у Маскву зьвярнулася да ленінградзкага пралетарыяту з дэкларацыяй, у якой, між іншым, зазначае: «Нават пасьля кароткага пабыту ў Ленінградзе выразна відаць, што небясьпека амэрыканскага друку і прафсаюзных бюракратаў, якія перашкаджаюць падарожжу рабочых дэлегацый у СССР, мае падставу.

Трэба амэрыканскаму рабочаму толькі ўласнымі вачыма ўбачыць царскія палацы і дамы буржуазеі, абернутыя ў музэі, дзіцячыя дамы і рабочыя клюбы, каб пераканацца, што тое самае трэба зрабіць з палацамі і маёнткамі амэрыканскіх міліярдэраў. Клянёмся сумленна перадаць у Амэрыцы праўду аб тым, што бачылі».

Прыезд амэрыканскіх рабочых-экскурсантаў.

МАСКВА, 5-7. Прыехала з Ленінграду група амэрыканскіх экскурсантаў-рабочых і служачых у ліку 35 чалавек.

Сярод экскурсантаў—72 гадовы стары, сталяр Майер, адзін з самых старэйшых камуністаў у сьвеце. Яшчэ ў 1879 г., пражываючы ў Лёндоне, Майер уступіў у рабочы саюз камуністычнага выхаваньня, заснаваны Марксам і Энгельсам, з якімі Майер сустракаўся.

Цукру хопіць-ураджай буракоў вялікі.

ХАРКАЎ, 4-VIII. Ураджай буракоў селета перавышае ўсе чаканьні і зьяўляецца рэкордным за апошнія 10 гадоў. У сярэднім ураджай дасягае 1000 пудоў з дзесяціны ў той час, як пры добрым ураджаі 1925 г. ён даваў толькі 870 пудоў. На зямлі цукратрэсту ў Палтаўскай акрузе ўраджайнасьць буракоў дасягае ў некаторых мясцох 2000 пудоў з дзесяціны.

У Савецкай Беларусі.

Выйшлі на правільны шлях.

(Махаедаўскі с.-с., Нараўлянскі р. Мазыршчына).

Наша спажывецкае т-ва распачало працу з 1919 г. Першыя гады т-ва чуць цягнула мізэрнае існаваньне. Растраты, вялікія штаты і нядбайнасьць яшчэ і цяпер жывуць у памяці махаедаўцаў. Зараз гэта ўсё зьнішчана.

За апошні год зварот тавараў і лік пашчыкаў значна вырасьлі. Так, напрыклад, у мінулым годзе зварот быў 9500 р., у гэтым годзе 14500 р.; пайшчыкаў было 550, цяпер маецца 885.

Уласны капітал павялічыўся у 3 разы, пабудована новае памяшканьне цэнтральнай крамы, пабудована кузьня і г. д. Цэны зьніжаны ў сярэднім на 7-8 проц., штат нагружан больш, як на 100 проц. **П. Гарбацэвіч.**

Беднату здаволілі.

(Арыбінскі райён, Аршанскае окр.).

У канцы ліпеня скончана праца па вучоту аб'ектаў ападаткаваньня.

Заможная частка сялянства рабіла спробы захаваць ад вучоту некаторыя аб'екты, але гэта ім не ўдалося. Беднота сачыла і ніякіх парушэньняў не дапусьціла. Адтак, група сялян за утойваньне жывёлы ад вучоту прыцягнуты да судовай адказнасьці.

Побач з вучотам сярод сялянства праводзілася тлумачэньне закону аб с.-г. падатку на 1927-28 г. Сяляне ўхваляюць усе зробленыя зьмены ў законе.

У 2-х сельсаветах (Карэбскім і Гасподаўскім) дзеля больш правільнага азначэньня норм прыбытковасьці хутарскія вёскі былі разьбіты на 2-3 часткі.

Гэты вопыт вельмі задаволіў сялян, якія пры земляўпарадкаваньні вышлі на пустую зямлю і атрымоўваюць кепскія ўраджаі.

Апусьцілі насы толькі сяляне, атрымаўшыя зямлю на сядзібе. Частка іх ў мінульным годзе патрапіла пад неабкладаемы мінімум, ці плаціла вельмі мізэрны падатак. Між тым гаспадарка гэтае часткі была вельмі моцнаю.

Разьбіўка хутарскіх вёсак на вучастку дала магчымасьць больш рацыянальна разьмеркаваць с.-г. падатак па гаспадарках.

Сяляне іншых вёсак (дзе ня было разьбіўкі) імкнуцца да гэтага відавочна. Больш таго,—яны выказваюцца на сходах за якнайхутэйшую разьбіўку іх вёсак на часткі. **В. К.**

Папаўняем паі да 10 р.

(Бабруйшчына).

Кожны месяц Рагачэўскае спаж. т-ва дае значныя вынікі ў справе павялічэньня таваразвароту, зьніжэньні цэн, памяншэньні накладных выдаткаў і г. д. У сучасны момант т-ва мае 2894 пайшчыкі, з якіх сялян 515, а рэшта рабочыя, служачыя і вайсковыя служачыя.

У фонд для каапэраваньня насельніцтва адпушчана 500 р., з якіх 300 р. было скарыстана на каапэраваньне бядняцкіх сялянскіх гаспадарак і 200 р. на каапэраваньне беспрацоўных членаў саюзаў.

Усяго каапэравана 277 чалавек. Таваразварот расьце наступным чынам; у 1925-26 годзе продаж прамтавараў складаў суму ў 328.500 руб., а ў 1926-27 г. за 8 месяцаў—420.000 р., што дае значнае павялічэньне; ня гледзячы на зьніжэньне цэн, якія на 1 чарвеня зьніжаны на 9,88 проц., зьніжэньне праводзілася, галоўным чынам, за лік памяншэньня накладных і гандлёвых выдаткаў, і часткова за лік прыбыткаў.

Прамтаварамі т-ва забясьпечваецца слаба, ды і разьмяркоўваюцца яны паміж знаёмымі праказчыкаў (напрыклад, тав. Гельфанд, крама № 3, прадаваў сукно «сваім»). У сучасны момант ідзе папаўненьне паёў да 10 р., згодна пастанове пайшчыкаў, а гэта дасьць магчымасьць яшчэ больш узмацніць працу т-ва і выканаць галоўную задачу—здавальненьне спажыўча таннымі і неабходнымі таварамі. **С-кі.**

„Абрэзка“ школы.

(М. Пухавічы, Менск. акр.).

Звычайна апэрацыі «па абрэзцы школ» робяцца органамі НКФ, калі ім прыходзіцца разглядаць каштарыс па нарасьвеце. Але яшчэ ніколі ня чуваць было, каб гэтаю справаю займаліся органы НКЗ. У нас-жа здарылася такое зьявішча і нават з самай буйнай школай—**з сямігодкай.**

Гадоў з пяць таму назад за нашай сямігодкай быў замацован кавалак зямлі з сенажацьцю. Праўда, сенажаць папала няўдалая (на якую ня квапіліся ні ўпаўнаважаныя па разьмеркаваньні зямель, ні іх кумы і сваты), але школьная рада думала і гэта пекалі скарыстаць у добры бок: зрабіць мэліярацыю і паказаць насельніцтву, што і з «багны» можна зрабіць добрую сенажаць. А пакуль што, дзякуючы цяжкаму матар'яльнаму становішчу школы, якая не магла заняцца гаспадаркай, зямельны вучастак спачатку выкарыстоўваўся настаўніцтвам сямігодкі і вартаўнікамі, а ў апошнія гады здаваўся ў арэнду на карысьць, выключна, школы. Пры гэтым умовы арэнды прадугледжвалі, з аднаго боку, ўгнаеньне зямлі і, з другога боку,—севазварот дзеля пераходу на шматпольле. Яшчэ год—другі, і сямігодка мела распачаць уласную гаспадарку з паказальным шматпольным севазваротам. А далейшыя пэрспэктывы—ужо былі вельмі шырокія...

На днях загадчык сямігодкі вывесіў абвесткі аб таргох на прадажу травы на сенажаці і пасеву вікі. Зьбіраюцца людзі і пытаюцца: «Дзе-ж ваша сенажаць?

— «А ў Левусавым».—«Мо там, што калісь настаўнікі і бальнічныя служачыя касілі?»—«Во, во—гэты самы»—«Дык-жа гэты ўжо даўно Нагулю адведзен!»—«?!»—«Дальбог, праўду кажу. Ён па гэтай справе езьдзіў нават у Маскву. Вярнуўшыся, казаў што зрабіў як хацеў. А зараз-жа пасьля таго каморнік адвёў яму 2 дзесяціны сенажаці, бо ў яго толькі 1 дзесяціна сядзібы. Бадай, ці не скасіў яе ўжо ён»...—Дык як-жа гэта? Я-ж нічога пра гэта ня ведаю! Ну, дык сёньня прадаецца толькі віка, а пра сенажаць будзе другая абвестка“ кончыў загадчык.

Але другой абвесткі яму ня прыдзецца пісаць: сенажаць сапраўды перададзена Нагулю, што нават пацьвердзілі адпаведныя органы НКЗ.

Вельмі цікава даведацца, на якой падставе зроблена такая «абрэзка» школы і яшчэ бяз усякага папярэджаньня? Здаецца і «кулацкія» гаспадаркі абразаюцца з папярэджаньнем, а тут ціха-крыта «абрэзалі» і ў той час, калі школа рашуча ўзялася за ўласную гаспадарку. А па Беларусі без сенажаці цяжка гаспадарыць і культурнаму гаспадару...

Мо' хто растлумачыць, што за недарэчнасьць вышла з сенажацьцю Пухавіцкай сямігодкі? **К.**

Падрыхтоўка да асеньняй сяўбы.

(Старобінскі р., Бабруйшчына).

Дзеля правядзеньня асеньняй паслёўной кампаніі Старобінскім райвыканкомам складзена камісія, у якую ўваходзяць прадстаўнікі ад розных устаноў.

Падрыхтоўчая праца да кампаніі пачалася з 1 жніўня.

Кампанія па ачыстцы насеньня пачынаецца з 10 жніўня. У буйна-населенных пунктах будуць праведзены даклады на таму «Карысьць ад ачысткі насеньня». Дзеля ачысткі насеннага матар'ялу з маючыхся машын будуць на сельсаветах арганізаваны стацыянарныя пункты на якіх маркуецца ачысьціць 4.000 пуд. Акрамя гэтага савгасам Пагост будзе ачышчана яшчэ 1500 пуд. Па пляну павінец быць таксама павялічан пасеў азімай пшаніцы з 814 дзес. (у мінулым годзе) да 850 дзес. і пратручана 1000 п. У мэтах здавальненьня насельніцтва палепшаным насеньнем савгасы Пагост і Бранчыцы павінны абмяняць 3000 пуд. сялянскага на сваё насеньне. Дзеля распаўсюджваньня штучных угнаеньняў сельска-гаспадарчай каапэрацыі прапанована загатовіць к тэрміну 230 пуд. У час асеньняй сяўбы будуць закладзены ў асобных гаспадарках, галоўным чынам у зямляўпарадкаванага насельніцтва, 10 паказальных вучасткаў з штучным угнаеньнем.

Таксама будуць праведзены на шматпольле 9 хутарскіх гаспадарак і абгледжаны раней уведзеныя севазвароты ў пасёлках Мецявічы і Жабіна.

Актыўны ўдзел прыймаюць таксама і камітэты ўзаемадапамогі. Дзеля здавальненьня бяднейшага насельніцтва насеньнем камітэтамі буде загатавана 120 пуд. гатункова жыта.

Таксама імі будзе арганізован прыкатны пункт дзеля абслугоўваньня гаспадарак, што ня маюць с. г. інвэнтару. У час кампаніі ў 3-х гаспадарках будуць праведзены калектыўныя заворкі на плошчы 7,50 дзес. Наогул, трэба сказаць, што дзякуючы своячасоваму пачатку падрыхтоўцы асеньняй сяўбы ў Старобінскім райёне дасьць добрыя вынікі. **М. Астроўскі.**

Арганізоўваем гужавую дапамогу.

(Узьдзенскі р., Меншчына).

Плян працы райннага камітэту ўзаемадапамогі за I і II квартал выканан амаль на 100 проц. Апошнім актам рэвізійнай камісіі была падкрэслена жывая сувязь райённага камітэту з вясковымі камітэтамі, а таксама і з партыйнымі і савецкімі органамі.

За апошні час камітэтам за сродкі вясковых КСУ каапэравана ў спажывецкую каапэрацыю 840 чал. беднякоў і 111 чал. у сельскагаспадарчую.

Камітэт з посьпехам правёў вясеньнюю сяўбу. Беднота райёну была здаволена насеньнем на 100 проц. Усяго раздадзена 2932 пуд. 16 хун. насеньня ў пазыку. Ачышчана 1700 пуд. збожжа.

Камітэтам пабудавана ў Камяноцкім с.-с. цагельня, якая штогод будзе выпрацоўваць 25.000 штук цаглін.

За апошні час камітэт зьвярнуў вялікую ўвагу на становішча хлебных магазынаў у райёне. Пабудаваны новыя магазыны для ссыпкі збожжа ў Магільнянскім, Стальбоўскім сельсаветах і райённы магазын ў м-ку Узьдзе. Апрача гэтага, адрамантаваны ўсе магазыны, якія маюцца пры вясковых камітэтах узаемадапамогі.

Беднаце, пры атрыманьні пазык у крэдытным с.-г. т-ве камітэтам дадзены паручыцельствы на суму 1115 р. Апрача гэтага, па хадатайніцтву камітэту атрымана з сел.-гас. крэдыту ў часе пасьлёўной кампаніі 1560 рублёў.

Камітэтам завязана сувязь з саюзам рабземлес, пры дапамозе якога ў часе лесасеяньня ці лесаўпарадкаваньня беднякі атрымоўвалі сабе працу. За апошні час працу атрымалі 651 чалавек.

У працу камітэту ўзаемадапамогі ўцягнуты і нашы савгасы. У часе сяўбы і ўборкі ўраджаю яны дапамагаюць бядняцкім бясконным гаспадаркам бліжэйшых вёсак, апрацоўваць зямлю і звозіць новы ўраджай. Апрача гэтага, савгасы разьмяркоўваюць свае сенажаці толькі паміж беднякоў праз камітэты ўзаемадапамогі. Маецца точны вучот інвалідаў грамадзянскай і імпэрыялістычнай вайны і іх сем'яў, якіх у райёне маецца 140. З іх пэнсію атрымліваюць 42 сямействы. Таксама выдаецца штомесячная грашовая дапамога 12 бядняцкім сем'ям чырвонаармейцаў.

Пры райённым камітэце ўзаемадапамогі маецца даведчае бюро, якое дае ўсякія спраўкі і парады сялянству, на льготных умовах для серадняка і дармова для бедняка; піша розныя заявы і інш. Фонд камітэту ў параўнаньні з фондам мінулага году ўзрос на 100 проц.

У сучасны момант у камітэце ўзаемадапамогі маецца 1100 руб. 73 кап. і 93 пуд. 5 фун. жыта. У карыстаньні сяброў камітэту знаходзіцца 592 р. і 645 пуд. 30 фун. аўса і ячменю. У пэрыяд падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы камітэт мяркуе праводзіць гутаркі з сялянствам аб неабходнасьці ачысткі насеньня; загатаваць па 100 п. добраякаснага насеньня для кожнага вясковага камітэту ўзаемадапамогі для здаваленьня патрэб сяброў камітэту і арганізаваць гужавую дапамогу гаспадаркам, якія ня маюць коняй.

Селькор.

Ратуйце народнае багацьце.

[Валынецкі райён, Полаччына].

Пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі маёнтак Падазер'е, Кушлікаўскага сельсавету, астаўся ў карыстаньні некаторых малазямельных сялян суседніх вёсак.

Зямля там добрая, ёсьць розныя гаспадарчыя абсталяваньні і, можна было спадзявацца, што карыстаньне ёю будзе правільнае і прадукцыйнае.

Але-ж зусім ня тое наглядаецца ў гаспадарцы названага маёнтку. Абрабляюць сяляне зямлю самым старасьвецкім спосабам.

Для жывёлы засталіся ў «спадчыну» добрыя хлявы з вокнамі, кармушкамі і вадаправодам. Можна было-б і зімою паіць кароў ў хлеве,—нават ня сьцюдзёнаю вадою пры наліччы цэмантнай ямы, дзе абшарнік прыгатаўляў добрыя квасныя харчы для жывёлы. Былі і скляны для бульбы і кораньплодаў наогул, лядоўня і г. д.

Цяпер жа ўсё гэта зьнішчана. Выхаваньне жывёлы ідзе (па прыкладу апрацоўкі зямлі) самым дапатопным парадкам. Не прызнаюцца ніякія агранамічныя, культурныя парады і мерапрыёмствы для палепшаньня жывёлагадоўлі і прадукцыі ад яе.

Неабходна, каб агранамічныя сілы райёну зьвярнулі [illegible] доны зрэхіўны маёнтак і дапамаглі яму выкарабкацца на сьвет і наладзіць сваё жыцьцё.

Стары.

ВЕСТКІ З МЕСЦ.

79 новых школьных камплектаў.

Бабруйск. З новага навучальнага году ў вёсках нашай акругі адчыняецца 79 новых школьных камплектаў.

Дапамога пагарэльцам.

Магілеў. У в. Бярозаўцы (Кармянскі р.) 20 ліпеня здарыўся пажар, які зьнішчыў 48 двароў.

Прэзыдыум АВК даручыў зямельн. аддзелу адпусьціць бесплатна ўсім 48 дварам лесу з акруговага ільготнага фонду і разам з тым вырашыць пытаньне аб земляўпарадкаваньні вёскі.

Унівэрсальны магазын у Маркоўшчыне.

Віцебск. Для лепшага і поўнага абслугоўваньня рабочых фабрыкі «Двина» прадуктамі, Віцебскім ЦРК распачата пабудоўка каменнага будынку для ўнівэрсальнага магазына, які будзе адчынен к 10 гадавіне Кастр. рэвалюцыі.

Новая школа сялянскай моладзі.

Бябруйск. З новага навучальнага году Гарбацэвіцкая 7-годка рэарганізуецца ў школу сялянскай моладзі. Такім чынам, у нашай акрузе [illegible]

Манголафільства ў Сеньне.

Ранейшы павятовы горад Сенна, а зараз адзін з райённых цэнтраў Беларусі, даўно стаў нязначным пасяленьнем. Нават калі вы пачнеце шукаць яго ў энцыклёпэдычным слоўніку Брокгаўза і Эфрона, то і тут спаткаеце немалыя труднасьці. Забыўшыся аб існаваньні калісьці літары «ѣ», вы-кінутай рэвалюцыяй, вы пераглядзіце некалькі тамоў, пакуль дагадаецеся, што раней Сенна пісалася з гэтай літарай, і пераканаецеся ўрэшце, што аб ім не забыліся складаўшыя слоўнік.

Але калі ўспомніць аб нацпалітыцы, у прыватнасьці беларусізацыі, дык можна знайсьці рачавістыя доказы таго, што нязначны, нічым не адменны горад, заслугоўвае ўвагі.

Першы раз горад Сенна ў Савецкай Беларусі праславіўся ў 1924 г. Гэта—год, калі Беларуская рэспубліка ўзбуйнілася за лік Віцебшчыны і Гомельшчыны, прыняўшы значную тэрыторыю разам з г. Сеннам. Пасьля ўзбуйненьня перад савецкаю ўладаю паўсталі вялікія задачы. Былі напружаны ўсе сілы рэспублікі, каб іх выканаць. І вось у такі адказны момант горад Сенна вылез на паверхню, каб заявіць свае прэтэнзіі, якія, водгук дымкі двох жыхароў Сенна, зьяўляліся найбольш значнымі для рэспублікі.

Вучоны аграном і школьны працаўнік школы II ступені (прозьвішча якіх ня помнім, абодва працавалі тады ў г. Сеньне) падалі ў Наркамасьветы Беларусі і цэлы шэраг іншых вышэйшых органаў заяву, у якой, выказваючы сваю радасьць з прычыны далучэньня іх павету да БССР (бліжэй рэспубліканскі цэнтр, больш шпаркі гаспадарчы і культурны рост Беларусі пасьля ўзбуйненьня і г. д.), настойліва патрабавалі, каб Беларуская рэспубліка занялася ў першую чаргу іх праэктам адраджэньня народнай гаспадаркі і культуры Беларусі.

Праэкт складаўся з наступнага. Абодва аўтары яшчэ з даўніх часоў марылі вывучыць флёру і фаўну жывёлы і расьліны), а таксама быт і нравы жыхароў Сярэдняй Азіі і асабліва Манголіі. Хто першы [падштырхнуў і захапіў іхную думку, накіраваўшы яе з г. Сенна ў Манголію,—да гэтага часу невядома. Але факт, што абодва спэцыялісты, седзячы ў Сенне, не змаглі ўжыць свае сілы на мейсцы, а займаліся літэратураю і... марамі аб краі, які знаходзіцца ад Сенна на адлегласьці некалькіх тысяч вёрст.

І вось зараз, пасьля такой радаснай для іх падзеі, як узбуйненьне БССР, аўтары лічылі, што ўрэшце настаў час ажыцьцяўленьня мары ўсяго іх жыцьця,—**арганізацыі экспэдыцыі для вывучэньня Манголіі.** Прапануючы сябе ў якасьці кіраўнікоў гэтай экспэдыцыі, дабрадушныя дзівакі прасілі выдзеліць ім з беларускай савецкай казны кругленькую суму. Але прымаючы пад увагу, што яе мала не хапіць, праэкт прадугледжваў вельмі цікавую камбінацыю: [мелася на ўвазе ўзаконіць «манголькую пошліну» з кожнага чалавека, атрымліваючага з любой касы на гэты ж касы якую небудзь суму—адлічваць на карысьць экспэдыцыі адну капейку. Дабрахвотныя ахвяры таксама прадугледжваліся праэктам.

Усё гэта, як адзначана вышэй, неабходна было для «росквіту бедной Савецкай Беларусі».

Дзіўна, як гэта аўтары вывучаючы ў працягу ўсяго свайго жыцьця, праведзенага ў Беларусі, літаратуру па пытаньні аб Манголіі, Цібэце і г. д. ня ўзялі пад увагу, што Манголія ўжо даўно і пасьпешна вывучаецца экспэдыцыяй Акадэміі Навук СССР пад кіраўніцтвам вядомага дасьледчыка Казлова.

Але, як відаць, ўбогасьць і беднасьць краю, у прыватнасьці Сеньненскага павету, была такая вялікая, што седзячы ў ім у якасьці аграномаў і школьных працаўнікоў людзі не знашлі нічога лепшага, як марыць аб далёкай Манголіі і росквіце Беларусі пры дапамозе вывучэньня «мёртвых гарадоў» засыпаных пяском манголькіх пустынь.

Мы ня помнім, які адказ даў Наркамасьветы грамадзянам гораду Сенна, якія абясьсьмерцілі сябе манголькімі імкненьнямі. Памятуем толькі, што ім адмовілі ў кругленькай суме і ў іншых просьбах і параілі **заняцца прапагандай шматпольля, ліквідацыяй няпісьменнасьці, і калі пасьля гэтага ў іх застанецца вольны час, дык заняцца вывучэньнем у першую чаргу Сеньненскага павету.**

У 1927 годзе штосьці ўжо ня чутно, каб у Сеньне зноў займаліся арганізацыяй экспэдыцыі для вывучэньня Манголіі. Але што там да гэ

Беларускія курорты.

Справа курортная—сезонная справа сёньня. На вуліцы Менску—мяцеліца з пылу, навстра—як «ліпавы мёд». З кожнай сталоўкі, ці каморы, дзе выдаюць «домашние обеды», нясе такім «амброю» смажанай рыбы, цыбулі і іншых невядомых спэцый, што мімаволі марыш аб чыстым паветры, аб лесе і вадзе.

Куды ехаць, каб адпачыць? Куды ехаць, каб пазбыцца штодзённай таўкапіны, набрацца сілы, „супакоіць нэрвы?

Прычята па традыцыі пушчацца «за мора—акіян», у чужыя стороны, да якога месца трэба два-тры дні мучыцца ў вагоне, каб толькі даехаць. А між тым, колькі людзей жаліцца, што гэткае падарожжа—дарма выкінутыя грошы і дарма змарнаваны час!

Так, мы ня прывыклі яшчэ, не навучыліся выкарыстоўваць для адпачынку тое, што ў нас ёсьць пад бокам. Гэта—закаранелая традыцыя.

Вось ужо дваццаць—сорак год езьдзяць людзі ў Крым, на Каўказ—раней езьдзілі на Рыскае ўзмор'е. Але ці карысны былі хоць на 10 проц. гэтыя падарожжы з пункту гледжаньня здароўя,—гэтага хіба ніхто не адважыцца сцьвердзіць. Даўно даведзен навукай факт, што найлепш чалавек адпачывае ў тым краі і ў тым клімаце, дзе ён нарадзіўся. Аб гэтым напісана ў нашай і заходня-эўропэйскай мэдычнай літаратуры шмат старонак. Трэба толькі стварыць такія варункі, каб у месцы адпачынку запраўды былі ўсе ўмовы для гэтага: спакой, чыстае паветра, сухое памяшканьне, танныя і сытныя харчы.

На гэтым прынцыпе пабудованы знаменітыя нямецкія курорты, як і наогул пабудована нямецкае жыцьцё. Немцы зразумелі, што для таго, каб чалавек адпачыў, супакоіў нэрвы і падлячыў крыху сваё здароўе*), трэба перамяніць абстаноўку і ўвайсьці ў адпаведны рэжым.

У самым Бэрліне (Шарлотэнбург, Грунэвальд)—цэнтры нямецкае індустрыі і палітыкі, дзе нэрв жыцьця б'ецца з ліхарадачным напружаньнем, вы сустрэнеце дзесяткі санаторый, у якіх можна лепш адпачыць, чымся ў якім небудзь беларускім Капылю—ня гледзячы на тое, што Бэрліну далёка да Капыля ў сэнсе цішыні і блізкасьці да прыроды. Тое самае ў нямецкай правінцыі—Шварцвальдзе, Турынгіі і г. д. Прырода і наветра Фінляндыі таксама ня лепшыя ад беларускіх, а між тым народ туды валам валіць адпачываць і набірацца сіл.

Уся справа ў варунках, якія стварае сам чалавек.

На Беларусі ёсьць цудоўныя мясцовасьці, прыгажэйшыя куточкі, здаравейшыя абшары, на якіх можна было-б арганізаваць найлепшыя месцы для курортаў і летняга адпачынку. Што можа быць даражэй для беларуса (ды і ня толькі для беларуса), чым сасновы лес, рэчка ў пяшчаных берагох ды вясковая цішыня? Што можа замяніць нам росны час усходу сонца ў полі, сярод палявых кветак, або пагодны вечар на сенажаці? А чарніцы, суніцы, цэлая стыхія грыбоў у лесе, на нагрэтых сонцам лясных прагалінах?

Усе курорты Эўропы і ўзьбярэжжа Сяродземнага мора мала аддаць за гэта!

А між тым спрабуйце ўсладзіцца гэтым. Спрабуйце паехаць на вёску, як «на дачу»—і вы праклянеце і росную раніцу і прыгожы, гэтак дарагі вашаму сэрцу вечар.

Наперш-ж—вы ня знойдзеце там чыстай хаты. Падругое—вы ня знойдзеце там ні хлеба, ні масла, ні мяса, ні яек,—гэта знача, нічога такога, што патрэбна чалавеку для таго, каб сярод нашэй прозаічна насыціцца. Усё патрэбнае вам вы прымушаны будзеце на просту «перці гарбом» з гораду, або з бліжэйшага мястэчка. Патрэцяе—з вас зьдзяруць за хлеў, за мух і бруд гэткую цану, што ўсякія «крымы» выйдуць таньней.

Што за ліха? Хто ці што гэтаму прычынай? Мо' усяго гэтага ў нас няма, ці ўсяго патрэбнага мы ня можам зрабіць?

— Усё гэта ёсьць, але мы ня ўмеем яго «ўзяць». Прычынай усяму наша накультурнасьць і неарганізаванасьць. Да гэтага часу мы не памкнуліся, каб хоць крыху дапамагчы сабе ў гэткай наважнай і пільнай справе, як летні адпачынак. Мы ідзём, як кажуць, «па лініі найменшага працёўленьня», і сьледам за дзедам—езьдзім на Каўказ, Бярдзянск і г. д. А каб зрабіць сабе ўсе гэта ў сябе, ды з пункту гледжаньня здароўя і эканоміі яшчэ лепшае, дык аб гэтым нам галава не баліць.

Надоечы вярнулася ў Менск экспэдыцыя Інбелкульту, якая дасьледвала курортныя мясцовасьці Беларусі. Экспэдыцыя абгледзіла толькі малую частку БССР, ледзь дзьве акругі—Аршанскую і Полацкую.

І вось што яна піша:

„Полацак можа быць месцам добрага адпачынку, месцам разьвіцьця плаўнага спорту, дасканалага купаньня і сонечных ваннаў. Да гэтага часу на Дзьвіне ў Полацку няма аніводнае купальні, ня прыведзены да парадку пляж, рака не выкарыстоўваецца ні для спорту, ні для фізычнае культуры, ні як фактар правядзеньня кампаніі па аздараўленьні дзяцей. На гэта патрэбна зьвярнуць пільную ўвагу мясцовых органаў, савету фізкультуры, адделу аховы здароўя, прафсаюзаў".

Чытаем далей:

„Возера Белае каля Полацку,—стары шлях, мясцовасьць сухая, высокая, пакрытая дасканалым борам. Берагі возера абрывістыя, пакрытыя добрым дзірванам. Край возера чысты, бяз порасьлі, пераходзіць у белы пясок дна. Дно паволі наглыбляецца, цьвёрдае, гладкае, з чыстага белага пяску. Яміны і правалы насельніцтву не вядомы. Празрыстасьць вады дзіўная: на глыбіні 3 мэтраў дасканала відаць дно. Па фізычных якасьцях вада возера дасканалая, мяккая, бяз паху і прыемная на смак. Ачышчаецца вада ад замучваньня менш як праз адну мінуту. Краявід выключна прыгожы: на паўднёвы захад ляжыць прыгожае люстра сіняга вадаёму Белага возера, на поўначы ляжыць аточанае гаем возера Званае, побач ляжыць чысьцюткая вёска Цінаўка, г. д.".

Як бачым, нават навуковая экспэдыцыя, якая мела сваім заданьнем браць хімічныя пробы, дасьледваць глебу ды эканоміку мясцовасьці, і тая ня ўтрымалася ад лірычнага адступленьня пры характарыстыцы прыгожага куточка Беларусі.

А ці мала гэткіх куточкаў, ды можа і яшчэ лепшых? Прыкладам, Баркаўшчына, з яе знамянітымі крыніцамі, зьяўляецца былым курортам, які экспёатаваўся прыватнымі прадпрыёмцамі больш як 20 год, пакуль яго ня зьнішчыла вайна. А Лагойск, а Мсьціслаўшчына? Па ўсіх 10 акругах БССР ёсьць даволі пекнаты прыроды, каб скарыстаць яе па простым прызначэньні—знайсьці сярод яе здароўе і прыемны адпачынак.

Даўно прысьпела пара, каб больш паважна заняцца справай курортаў на Беларусі. Экспэдыцыя Інбелькульту і папярэднія досьледы НКАховы Здароўя—толькі пачатак таму. Але адными экспэдыцыямі і вучонымі выкладкамі тут справы ня зробіш. Тут трэба, каб шырокія колы нашага савецкага беларускага грамадзянства зацікавіліся справай і пачалі рабіць адпаведную «курортную палітыку». Трэба, каб пры якой небудзь грамадзкай установе, як, прыкладам, Чырвоным Крыжу разам з Цэнтральным Бюро Краязнаўства, залажылася адпаведнае таварыства і каб яно расштурхала патрэбную масавую ініцыятыву.

Трэба толькі пачаць—і пабачыце, колькі знойдзецца людзей, якія з ахвотай прымуць у гэтым удзел. Будзьце пэўны, што на Беларусі знойдуцца сотні сем'яў, якія з вялікай прыемнасьцю пераменяць спаленыя сонцам крымскія скалы і д'яблоўскую сьнякоту на мяккі наш краявід і ўтульнае царства зеляніны.

Барацьба за беларускі курорт ёсьць барацьба за новы—прыгожы, здаровы і танны быт.

Аляксандр Цьвікевіч.

*) Мы ня кажам у данным выпадку аб хранічных ці небясьпечных хваробах, калі патрабуюцца спэцыяльныя варункі лячэньня: мінэральная вада, гразі, марскія ванны.

Райённыя аддзяленьні БДВ сябе апраўдваюць.

У «Сав. Бел.» № 167 ад 26-VII—г. г. у артыкуле «Райённыя аддзяленьні БДВ нельга зачыніць» высьвятлялася, што гэтыя аддзяленьні заўляюцца каштоўным культурным асяродкам у тым сэнсе, каб прасунуць лягчэй на вёску кніжку; перадача гандлю кніжкамі, напр., каапэрацыі загубіць маладую наладжаную справу. Згаджаючыся з гэтымі палажэньнямі, я хачу прывесьці яшчэ такія данныя, якія паказваюць, што райённыя аддзяленьні БДВ апраўдваюць сябе і з матар'яльнага боку.

Буду гаварыць аб Пухавіцкім (або Марына-Горскім) райённым аддзяленьні БДВ.

За дзевяць месяцаў—з кастрычніка 1926 г. па м-ц чэрвень г. г. уключна Пухавіцкае райённае аддзяленьне БДВ прадало кніжак на 1776 руб. 02 кап., канцэлярскіх прыладаў—на 2651 р. 68 к. Прыбытку ад продажу кніжак маецца 35%, або 620 руб. 60 к., ад продажу канцэлярскіх прыладаў—15 проц., або 397 р. 65 к.; разам-жа прыбытку за 9 месяцаў маецца 1018 р. 25 к. Выдаткі за 1 месяц такія: памяшканьне каштуе 10 р., пэнсія прадаўцу 15 руб., процанты яму-ж ад продажу ў сярэднім рублёў 15, патэнт на продаж рублі 3 і інш. дробныя выдаткі, разам-жа ня больш 50 руб. За 9 месяцаў выдаткаў, такім чынам, бывае ня больш 450 р.

Значыцца; чыстага прыбытку за 9 месяцаў Пухавіцкае райённае аддзяленьне БДВ дало 568 руб. 25 к. Заработкі невялікія, але ёсьць.

Стратаў няма. Калі-ж заўважым культурна-палітычную каштоўнасьць існаваньня ў райёне такой установы, як кнігарня БДВ, дык гэты заработак у пяцьсот з лішкам рублёў трэба толькі вітаць!

Цяпер з ліквідацыяй Слуцкай акругі пашырэцца Пухавіцкі райён далучэньнем новых пяці сельсаветаў з пачатковымі школамі і 1 сямёгходкай. Зварот Пухавіцкага райённага аддзяленьня БДВ бязумоўна павялічыцца.

А хоць дзе і няма пашырэньня райёнаў, дык усёроўна мы ўсюды нагладаем з кожным годам рост культурнасьці, асьветы ў выглядзе пашырэньня сеткі школ, хат-чытальнь, у выглядзе выпіскі сялянамі газэт і г. д. А ўсё гэта цягне за сабою і большае запытаньне з боку вёскі на кніжку. Галоўным пакупцом у Пухавіцкім райённым аддзяленьні БДВ якраз і зьяўляюцца сяляне, рабочыя савецкіх гаспадарак, вучні школ, з якіх дзьве сямігодкі.

Што каапэрацыя ня справіцца з продажам кніжак, дык няма што „пра гэта і казаць. Перш усяго, кніжцы патрэбна адпавядаючая будыніна, дзе селяніп, рабочы, або вясковы вучань (гал. чынам, разумесцца сямігодкі) мог-бы спакойна разглядзець кніжку, пагаварыць з прадаўцом. Там, дзе тлум ды штырханіна, як гэта наглядаецца скрозь у нашых каапэратывах, дзе разам і бочкі з селядцамі, з газаю і з крупамі,—там кніжка ходу мець ня будзе. Урэшце, каапэрацыя і сама прымушана будзе адмовіцца ад навыгоднай для яе апэрацыі, бо ў сілу прыведзеных прычын кніжка будзе залежвацца, асабліва пры такім падборы малакваліфікаваных прадаўцоў у райённай каапэрацыі.

У райённых-жа аддзяленьнях БДВ прадаўцы ужо больш-менш здавальняючыя, ёсьць і старыя прадаўцы кніжак, якія любяць гэту справу і стараюцца прыцягнуць да кніжкі купца.

Ня трэба вельмі захапляцца рэжымам эканоміі і перагібаць палку. Калі райённыя аддзяленьні БДВ ёсьць бязумоўна культурна-палітычныя асяродкі і калі яны сябе матар'яльна апраўдваюць, як прадпрыёмства, то ліквідацыя іх ня мае ніякага сэнсу. Ад ліквідацыі іх будзе выкінут неабдумана карысная шрубка ў справе пашырэньня культурнасьці наогул у нашу вёску.

Вясковая школа, вясковая хата-чытальня, райённы нардом, райённая сямёхгодка і райённая кнігарня—гэта роўнай вартасьці агітатары і рычагі па будаўніцтве новай савецкай вёскі. Не аб зачыненьні райённых кнігарняў трэба гаварыць, а толькі аб палепшаньні, аб пашырэньні іх працы.

Вось на днях заходзіць да мяне адзін дзяцюк і рэкамэндуецца агэнтам кніжнага выдавецтва «Прибой». І дакументы паказаў. Прапануе выпісаць і кніжкі, і «Унівэрсытэт па даму» і інш.

Быццам гэтага нельга зрабіць праз райённае адз. БДВ! Мала таго, дзяцюк расказвае, што ён «раз'яжджае па райёнах», а на ст. Пухавічы паняў «кватэру» і наладзіў нешта накшталт кніжнага складзіка!

Бачыце, колькі тут лішніх, непатрэбных страт для дзяржавы ад такіх агэнтаў.

Іх, розных агэнтаў і прадстаўнікоў, што «разьязджаюць па райёнах», «наймаюць кватэры» ды марнуюць дарма грошы,—вось іх дык трэба ліквідаваць. А сталую, карысную культурную ўстанову, якая нават апраўдвае сябе з матар'яльнага боку, нам трэба захаваць. У кантакце са школамі, хатамі-чытальнямі і райённымі аддзеламі нар. асьветы райённыя аддзяленьні БДВ могуць вельмі добра наладзіць сваю працу.

Мік. Шатэрнік.

У Савеце Народных Камісараў БССР.

3 жніўня г. г. Савет Народных Камісараў разгледзіў выпрацаваны Народным Камісарыятам Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі праэкт **аб пашырэньні праў сельскіх, местачковых і гарадзкіх саветаў і раённых выканаўчых камітэтаў.**

Праэкт гэты, прыняты Саветам Народных Камісараў з некаторымі папраўкамі, пашырае ў адпаведнасьці з рашэньнем VIII Усебеларускага Зьезду Саветаў, правы сельскіх, местачковых і гарадзкіх саветаў і раённых выканаўчых камітэтаў у многіх напрамках.

Сельскім саветам, якія маюць свой бюджэт, даюцца правы, прадугледжаныя палажэньнем аб местачковых саветах, а таксама па пабыцьці маемасьці, па звароту непасрэдна ў даходы свайго бюджэту вызначанага процанту адлічэньняў усіх бюджэтных сум ад адпаведных дзяржайных падаткаў і даходаў, па адчужэньні і здачы маемасьці ў арэнду, на заключэньні кароткатэрміновых пазычак у дзяржаўных, каапэрацыйных і крэдытных установах.

Разам з гэтым сельскім і мэстачковым саветам дадзена права нагляду за правядзеньнем у жыцьцё мерапрыёмстваў савецкіх і гаспадарчых органаў па тэрыторыі сельскіх саветаў у галінах дарожнага будаўніцтва, агрыкультурнай, асьветнай і інш. Сельскім і местачковым саветам таксама перадаюцца ўсе справы па апецы, дадзены правы накладаньня адміністрацыйных пакараньняў да 3 р. або прымусовых работ да 3 дзён за парушэньне абавязковых пастаноў, права прыцягненьня да дысцыплінарнай адказнасьці сваіх членаў за невыкананьне ўскладзеных на іх абавязкаў; таксама разбор канфліктаў, якія ўзьнікаюць пры ўжываньні наёмнае працы, прыём сельска-гаспадарчага падатку і страхавых плацяжоў і г. д.

Значна пашыраюцца правы раённых выканаўчых камітэтаў. Уся сетка ўстаноў народнае асьветы перадаецца тым саветам і выканаўчым камітэтам, на бюджэце якіх яны знаходзяцца. За акруговымі органамі народнае асьветы застаецца толькі мэтадычнае кіраўніцтва гэтымі ўстановамі і інструктаваньне іх. У адпаведнасьці з гэтым сетка культурна-асьветных устаноў у сельскіх мясцовасьцях і мястэчках выпрацоўваецца раённымі выканаўчымі камітэтамі, якім дадзена права адчыняць крэдыты па мясцовым бюджэце культурна-асьветным і лекава-санітарным установам, якія праходзяць на бюджэтах гэтых раённых выканаўчых камітэтаў.

Дзяржаўны фонд соцыяльнага забясьпечаньня перадаецца ў раённы бюджэт. Раённым выканаўчым камітэтам дадзена права разгледжаньня хадайніцтваў аб выдачы пэнсіі па сацыяльным становішчы.

У райённы бюджэт перадаюцца таксама ўсе асыгнаваньні на агрыкультурныя мерапрыёмствы раённага значэньня. У галіне землеўпарадкаваньня, паводле праэкту, у веданьне райвыканкомаў пераходзіць складаньне і зацьверджаньне вытворчых землеўпарадчых плянаў на райёну ў межах адпушчаных сродкаў, разьмеркаваньне дзяржаўных бюджэтных і банкаўскіх крэдытаў у межах лімітаў, зацьверджаньне ў натуры землеўпарадчых праэктаў і кантроль над іх выкананьнем. На канчатковае вырашэньне раённых выканаўчых камітэтаў перадаюцца справы аб незаконных парубках у лясох мясцовага значэньня і аб няправільным разьмеркаваньні драўніны ў тых-жа лясох.

Значна спрашчаецца водпуск лесу насяленьню, які пераходзіць да лясьнічых пад кантролем раённых выканаўчых камітэтаў. Разам з гэтым лясьнічым дадзена права адтэрмінаваньня плацяжоў па лесарубачных білетах да 1 году, правядзеньне таргоў па астачу лесасек на суму да 5 тысяч рублёў, заключэньне дагавораў на здачу насяленьню ў часовае сельска-гаспадарчае карыстаньне лясных плошчаў.

Уся апэрацыйная праца па перасяленьні, як складаньне сьпісаў перасяленцаў, адпраўка хадакоў, матар'яльная дапамога і г. д. перадаецца раённым выканаўчым камітэтам. За акруговымі зямельнымі аддзеламі застаецца толькі дырэктыўнае кіраўніцтва перасяленьнем. На раённыя выканаўчыя камітэты ўскладзена страхавая справа, як па акладным, так і па дабраахвотным страхаваньні. Таксама ім дадзена права канчатковай ліквідацыі страт па пажарах да 1000 р. і па падзяку жывёлы—да 200 р.

У мэтах большага ўцягненьня рабочых да ўдзелу ў культурным і гаспадарчым будаўніцтве, а таксама для агульнага ажыўленьня работы саветаў, праэкт прызнае неабходным арганізацыю пры прэзыдыумах гарадзкіх саветаў тэхнічнага апарату для кіраваньня і загадваньня камунальнаю гаспадаркаю, для загадваньня і кіраваньня культурна-асьветнымі і лекавымі ўстановамі, якія знаходзяцца ў веданьні гарадзкіх інспэктароў народнае асьветы і аховы здароўя.

У адпаведнасьці з прынятым праэктам Савет Народных Камісараў даручыў Народнаму Камісарыяту Фінансаў пераглядзець і ўзгадніць з новым палажэньнем аб гарадзкіх саветах заканадаўства аб мясцовых фінансах з тым каб за гарадзкім бюджэтам была замацавана поўная доля паступленьняў ад дзяржаўных падаткаў ад гарадзкіх аб'ектаў абкладаньня. Выканаўчым камітэтам і дзяржаўным органам запрапанавана да пачатку новага бюджэтнага году правесьці разьмежаваньне маемасьці з тым, каб маемасьць гарадзкога значэньня была перададзена ў веданьне і кіраваньне гарадзкіх саветаў, а Народнаму Камісарыяту Ўнутраных Спраў запрапанавана падаць у Савет Народных Камісараў праэкт пастановы аб адміністрацыйных правох гарадзкіх саветаў.

На тым жа пасяджэньні прыняты праэкт пастановы **аб зьмяненьні арт. 16-га пастановы ЦВК і СНК БССР аб вучнёўстве ў саматужнікаў, рамесьнікаў, прамысловай каапэрацыі і працоўных арцелях.** Паводле прынятага праэкту, кожнаму вучню да 18 год навінен давацца ў працягу году ня менш, як месячны водпуск, а вучням старэй за 18 год—водпуск ня менш 2-х тыдняў.

Абодвы праэкты перададзены на зацьверджаньне Прэзыдыуму ЦВК.

Ад лютага да Кастрычніка.

(Хроніка гістарычных падзей).

24 ліпеня (6 жніўня).

— «Рабочий и Солдат» пісаў: „Кару сьмерці ўвскрасілі. Час. урад пад націскам буржуазеі зрабіў гэты неймаверны крок"... „Катаў зноў запрашаюць заняць іх пасады. Кару сьмерці тым, хто гэтыя гады сядзеў у акопах, зносіў голад, холад, —для іх у рэвалюцыйнай Расеі не знайшлося нічога лепшага".

— Нарада памоцн. міністраў пры час. ур. пастанавіла: 1) адпусьціць 3 міл. рублёў у выглядзе ссуды савету зьезду горна-прамысловцаў паўднёвай Расеі, 2) адпусьціць ссуду ў 1 мільён руб, маскоўскаму акцыйнаму т-ву „Электропередача".

— А 10-й гадз. вечара адчынілася аб'яднанае пасяджэньне ЎЦВК і ВКУС Сял.Д., на якім выступіў з прамовай Разанаў з поваду арышту бальшавікоў:

„Пакуль Усер. Савет Р. і СД, які абапіраецца на 20 млн. салдат і рабочых, абраўшых яго, ня здольны забясьпечыць сабе праз сваіх членаў, пасланых у час. ур., недатыкальнасьць членаў, ЎЦВК...". У гэты час старшыня, які некалькі раз застанаўляў прамоўцу, прапануе пазбавіць Разанава слова. Сход пазбавіў Разанава слова, і апошні, разам са ўсімі бальшавікамі, пакінуў залю пасяджэньня. З прычыны атсутнасьці кворуму сход зачыніўся.

25 ліпеня (7 жніўня).

— „Вестник Гл. К-та Союза офицеров армии и флота" надрукаваў артыкул, у якім заклікае «да барацьбы бяз літасьці, усімі сродкамі, з афіцэрамі-бальшавікамі». Гал. К-т... «абвяшчае таксама адкрытую пагрозу па адрасу афіцэраў-бальшавікоў...».

— Краштадт. Пленарнае пасяджэньне савету пастанавіла запрапанаваць камісару В. П. Парэўскаму падаць у адстаўку (за непраўдзівыя артыкулы ў „Речи" аб Краштадце) і запрапанавала фракцыям намеціць новага камісара.

— Масква. Адбылося аб'яднанае пасяджэньне Саветаў Р. і СД. Прынята наступная рэзалюцыя па пытаньні аб кары сьмерці:

„Прымаючы пад увагу, што кара сьмерці, як інстытут пакараньня і застрашэньня, распушчае насяленьне і ўладу і можа быць лёгка выкарыстана ў інтарэсах контр-рэвалюцыі, МСР і СД рашуча пратэстуе супроць увядзеньня кары сьмерці, катэгарычна настайвае на перагледзе пытаньня аб кары сьмерці і на безадкладнай яе адмене».

26 ліпеня (8 жніўня).

— „Рабочий и Солдат" надрукаваў адказ Леніна з поваду прыцягненьня да суду «за зраду і арганізацыю ўзброенага паўстаньня» яго і інш. бальшавікоў.

— **Адчыніўся 6-ы зьезд РС-ДРП [б].**

Зьезд прыняў наступнае прывітаньне: „т.т. Леніну, Троцкаму, Зіноўеву, Луначарскаму, Каменеву, Калантай і ўсім іншым арыштаваным і прасьлядуемым таварышам»:

„Дарагія таварышы! Усерасейскі зьезд РС-ДРП бальшавікоў і інтэрнацыяналістаў засылае вам сваё шчырае братэрскае прывітаньне. Вам,—ахвярам падняўшай галаву контр-рэвалюцыі, якія церпяць у турмах, пабудаваных ганебнай памяці самадзяржаўем, шчырае прывітаньне і найшчырэйшыя пажаданьні!

Верце, таварышы, што сотні тысяч пралетарскіх сэрцаў б'юцца адноўкава з вашымі і веруе, што вочы ўсяго рэвалюцыйнага пралетарыяту зьвернуты на вас. Засылаючы вам прывітаньне, зьезд выказвае сваю глыбокую ўпэўненасьць, што блізка час, калі ідэі, за якія вы змагаліся і церпіце, ажыцьцёвяцца і вы, іх насіцелі, увойдзеце ў родную сямейку рэвалюцыйнае дэмакратыі».

— «Известия» надрукавалі 5 рэзалюцый буйных сходаў і арганізацый з патрабаваньнем роспуску «Гос. Думы і Гос. Совета».

За нармальны навучальны год!

Наша вясковая школа, у большасьці адпакамплектавая, за чатыры гады мала дае вучням як агульнага разьвіцьця, так і агульнай пісьменнасьці.

Да гэтага ёсьць шмат прычын: матар'яльныя ўмовы школы, недахоп падручнікаў і пісьмовых прыладаў, адсутнасьць у дзяцей цёплай вопраткі, перагружанасьць клясаў вучнямі, далёкасьць школы і г. д.

Усе гэтыя прычыны паступова пачынаюць ужо зьнішчацца. Будуюцца новыя школьныя памяшканьні, рамонтуюцца і ўцяпляюцца старыя будынкі, павялічваюцца выдаткі на ўтрыманьне школ, прасоўваюцца падручнікі і павялічваецца іх колькасьць, пашыраецца школьная сетка і зьмяншаецца школьны радыус.

Але ёсьць яшчэ дагэтуль адно ліха, якое надта шкодзіць вытворчасьці нашай вясковай школы—кароткі навучальны год.

Вясковыя школы позна пачынаюць заняткі і рана канчаюць.

Яшчэ да гэтага часу сярод насельніцтва вёсак моцна трымаецца традыцыя старой школы—пасылаць дзяцей у школу позна восенью, толькі пасьля 15 кастрычніка, пасьля «пакрову». Адгэтуль заняткі ў школах пачынаюцца не 15 верасьня, як гэта патрэбна, а 15-20 кастрычніка, а то і пазьней.

Назіраюцца і такія выпадкі, калі прыём у школу дзяцей цягнецца амальшто месяц. Вучні патроху кожны дзень прыбываюцца па адным па два. А то проста дзеці прыдуць у школу, запішуцца і зноў сядзяць дома, чакаючы, пакуль прыдзе сапраўдны школьны час, пасьля «пакрову», г. зн. 15-га кастрычніка.

Далей па тэй-жа самай традыцыі вучні пакідаюць школу, як толькі сойдзе сьнег—у канцы сакавіка. Да нармальнага канца навучальнага году ходзіць толькі частка выпускнікоў.

Бываюць выпадкі, калі навучальны год у некаторых вясковых школах, за выключэньнем зімовых канікул, ахапляе 100-120 дзён. Калі-ж прыняць пад увагу, што ў некаторых школах, таксама па традыцыі, вучні не наведваюцца ў школу і ў часы рэлігійных сьвят (каляды і інш.), то навучальны год яшчэ больш скараціцца.

На позны пачатак заняткаў мае ўплыў і несвачасовы рамонт школьных будынкаў і наём прыватных памяшканьняў.

Наступае навучальны год, трэба ўжо рабіць прыём вучняў, распачынаць заняткі, а школа ўсё яшчэ рамонтуецца.

Бывае і так. Прыяжджае настаўнік пасьля адпачынку ў школу, а памяшканьня няма. На памяшканьне мінулага году ўмова ўжо страціла моц, і гаспадар ня пушчае, а на гэты год яшчэ ня думалі аб падшуканьні памяшканьня і заключэньні ўмовы. Пачынаецца паездка ў райвыканком, назад у вёску, перамовы і г. д., а заняткаў тым часам няма.

Шкодзіць нармальнаму пачатку навучальнага году і несвачасовасьць забясьпечаньня школ падручнікамі.

Назіраюцца такія выпадкі. Даўно распачаліся заняткі, а падручнікі ляжаць у РВК. Загадчык райкультаддзелу чакае чарговай настаўніцкай канфэрэнцыі, на якой і мяркуе раздаваць атрыманыя падручнікі. А чарговая настаўніцкая канфэрэнцыя будзе толькі праз месяц.

Настаўнік ня можа без падручнікаў нармальна весьці заняткі, бацькі і вучні нездаволены школай.

Зараз набліжаецца новы навучальны год. Трэба абмеркаваць і стала падрыхтаваць да нармальнага яго пачатку. Падрыхтаваць абсталяваньне, скончыць рамонт будынку, адпукаць лепшыя памяшканьні для наёмных школ, сваячасова забясьпечыць школы падручнікамі, правесьці ўкамплектаваньне школ настаўнікамі, прыняць меры да сваячасовай яўкі ў школу дзяцей.

Асьветным установам і настаўнікам трэба выкінуць лёзунг «За нармальны навучальны год!» Гэта пытаньне абгаварыць на райённых настаўніцкіх канфэрэнцыях, райённых курсах, на надрайённых сходах.

Намеціць шэраг мерапрыёмстваў па ўдаўжэньні навучальнага году, а галоўным чынам на сваячасовым пачатку заняткаў.

Трэба шырока апавясьціць аб часе заняткаў насельніцтва школьнага райёну, правесьці бацькоўскія сходы па гэтым пытаньні, прыцягнуць да гэтага вучнёўскае самакіраваньне, савецкія ўстановы і грамадзкія арганізацыі.

Вядомая рэч, што мае значны ўплыў на сваячасовы пачатак заняткаў і аўтарытэтнасьць настаўніка. Прысутнасьць яго ў школе загадзя да навучальнага году, яго сталая падрыхтоўка да нармальнага пачатку заняткаў як нельга лепш адаб'ецца на сваячасовай пасылцы дзяцей у школу.

Нармальны пачатак заняткаў уздымае агульную пісьменнасьць вучняў і аўтарытэтнасьць школы сярод насельніцтва.

Бабруйск.

Антаневіч.

АЛЬБЭРТ РЫС ВІЛЬЯМС.

(Амэрыканскі журналіст).

Чырвоная гвардыя, белая гвардыя і чорная сотня.

(З кніжкі Альбэрта Рыс Вільямса „НАРОДНЫЯ МАСЫ Ў РАСЕЙСКАЙ РЕВАЛЮЦЫІ")

СІЛЫ, НЕ ПАМЯНУТЫЯ Ў ВАЙСКОВАЙ СТРАТЭГІІ.

Саветы абвясьцілі сябе ўрадам 7 лістапада. Але ўзяць уладу гэта—адно, а ўтрымаць яе—другое.

Неўзабаве саветы набылі вялікую балвую моц. Яны скарысталі таксама балвую сілу пакалечанага ваеннага апарату, які ў той час спыніў сваю чынпасьць, бо афіцэры сабатавалі. Рэвалюцыйны генэральны штаб ня мог яго выправіць зьверху і зьвярнуўся непасрэдна да рабочых.

Было захоплена 10000 вінтовак, якія накроўваліся Каледзіну, і разьмяркованы паміж заводамі, дзе праца [illegible] маршыроўкай.

Замест загадаў майстраў, [illegible] ры гучаць словы каманды матросаў, якія абучалі нясьпрытныя дабрахвотніцкія атрады.

На вуліцах насіліся маторы, раскідаючы адозвы з заклікам да зброі.

У адказ на покліч усюды зьяўляюцца рабочыя з патранташамі на паліце, з рыдлёўкай, кацялком і рэвальвэрам пад дзягай. Доўгія няправільныя лініі штыкоў разьвінуліся ў цэпры.

Чырвоны Петраград узьнімаецца ўзброеным, каб адбіць наступаючыя з поўдню сілы контр-рэвалюцыі.

Стракатая, пазіміоваму апрануная грамада. Ні сьцягаў, ні надбадрываючых барабанаў.

Налі і лясы напаўняюцца цёмнымі зданямі, якія расстаўляюць палаткі, [illegible] расьцягваюць дрот. Яшчэ кароткі дзень, і дзесяткі тысяч, пасунуўшыся на дваццаць міль ад Петраграду, спыняюцца жывым аплотам супроць сіл контр-рэвалюцыі.

Для вайсковых экспэртаў гэта ня больш, як збродная армія. Але гэтым «збродам» кіруюць імкненьні і сілы, яшчэ не памянутыя ў стратэгіі. Агонь кулямётаў косіць і растраівае іхныя шэрагі, але яны зноў зьбіраюцца. Раненых выносяць з агня і перавязваюць; паміраючых праводзяць са словамі «рэвалюцыя», «народ»—і тыя паміраюць з апошнім подыхам: «Няхай жывуць саветы!».

Непарадак, паніка растраіваюць, бязумоўна, шэрагі гэтых навабранцаў з фабрыкі і логваў, але запал змаганьнікаў за сваю справу, хоць і змучаных голадам і працай, аказваецца больш моцным фактарам, чымся дысцыпліна правільна арганізаваных батальёнаў іхнага ворага. Ён растраівае гэтыя батальёны, ён перамагае дух загартаваных у баёх казакаў. «Верныя» дывізіі, узятыя з фронту, рашуча адмаўляюцца растрэліваць рабочых.

Супраціўленьне зломана, і тав. Керанскі, пераапрануўшыся уцякае з фронту. Галоўнакамандуючы арміямі, прызначанымі дзеля зьнішчэньня бальшавікоў, ня можа прымусіць свой асабовы канвой уцякаць з ім. Пралетарыі перамагаюць на ўсёй лініі.

БЕЛЫЯ ЗАЙМАЮЦЬ ТЭЛЕФОННУЮ СТАНЦЫЮ.

У той час, як савецкія масы бяцца каля Петраграду, контр-рэвалюцыя рантам узьнімае галаву ў тылу, каб надсеч сілу савету ў самым Петраградзе.

Юнкеры, якія нядаўна далі слова пасьля здачы ў Зімнім дварцы, парушаюць клятву і далучаюцца да гэтай паўстаўшай белай гвардыі. Ім даецца даручэньне захапіць тэлефонную станцыю.

Тэлефонная станцыя—адзін з жыцьцёвых асяродкаў сталіцы. Адсюль разьбягаецца міліён дротаў, якія, нібы нэрвы, зьвязваюць горад. У Петраградзе тэлефонная станцыя зьмяшчаецца ў аграмадным каменным будынку на Марской вуліцы.

Тут была пастаўлена варта. Увечары ёй павінна была прыйсьці зьмена.

На вуліцы паказаўся атрад у дваццаць чалавек. Вартаўнікі думалі, што прышла чаканая зьмена. Але аказалася іншае. Гэта быў атрад афіцэраў і юнкераў, якія пераапранулися за чырвоных. Яны кажуць чырвоным пароль. Тыя даверчыва ставяць вінтоўкі ў стойку і зьбіраюцца ісьці. Раптам на іх наводзяць дваццаць рэвальвэраў.

— Таварышы!—ускрыкваюць зьдзіўленыя чырвоныя.

— Маўчаць, сьвіньні! — крычаць афіцэры.—Ідзіце ў тую залю і трымайце язык за зубамі, а то мы вас перастраляем.

Дзьверы зачыніліся за ашуканымі вартаўнікамі, якія замест зьмены і вызваленьня нападаюць у палон да белых.

Такім чынам, тэлефонная станцыя ў руках контр-рэвалюцыі.

Раніцой новыя гаспадары канчалі ўмацаваньне станцыі пад кіраўніцтвам францускага афіцэра.

Абапал галоўнага ўходу юнкеры парабілі барыкады са скрынак, аўтамабіляў і бярвеньня. Яны вабілі праяжджаўшыя аўтамабілі і лавілі прахожых, якія, па іхнай думцы, маглі быць на савецкай службе. Такім чынам ім дастаўся вялікі прыз у асобе Антонава, савецкага камісара па вайсковых справах. Яго сьцягнулі з аўтамабіля і пасадзілі пад замок. Такім чынам і ён папаўся ў палон да контр-рэвалюцыянэраў.

Сярод неарганізаваных мас рэвалюцыйнага Петраграду правадыроў было вельмі мала. Юнкеры ведалі, на падставе данных вайсковай навукі, што масы без кіраўнікоў ня могуць з посьпехам змагацца супроць іхнай моцы, а вайсковы кіраўнік быў зараз у іхных руках.

РЭВАЛЮЦЫЯ ЗЬБІРАЕ СВАЕ СІЛЫ.

Але галоўнага гэтыя афіцэры ня ведалі. Ня ведалі яны, што рэвалюцыя не залежыць ад аднэй або нават некалькіх галоў, але залежыць ад калектыўнай сьвядомасьці мас. Яны ня ведалі, як глыбока рэвалюцыя захапіла розум, і іні

„Наш адказ Чэмбэрлену“.

Адгукваючыся на выклік т. Коласа, прашу рэдакцыю журнала «Асьвета» перавесьці ў фонд абароны мой ганарар за рэцэнзію на вайсковую чытанку „Барацьбы“ і выклікаю ўнесьці, на 10 руб. кожнага аўтара чытанкі т.т. А. Бараноўскага, В. Акіфрэ і В. Залуцкага. Мікола Байноў.

Братэрская дапамога.

69.000 руб. сялянам Заходняй Беларусі.

Учора адбылося пашыранае пасяджэньне ЦК МОПР'у БССР. У пасяджэньні прымалі ўдзел прадстаўнікі камітэту сялянскай узаемадапамогі, жаночых камітэтаў і інш.

У парадку дню пасяджэньня было адно надзвычайна важнае пытаньне—падвядзеньне вынікаў кампаніі дапамогі сялянам Зах. Беларусі. Інфармацыю зрабіў т. Паноў.

Як толькі пралетарыят Савецкай Беларусі даведаўся, што яго замежныя браты галадуюць, што ў выніку фашысцкага тэрору ў турмах апынуліся сотні сялян,—адразу зьявілася думка дапамагчы замежным гаротнікам.

Гэта думка ахапіла шырокія колы працоўных. У ЦК МОПР'у, у мясцовых друк пасыпаліся заявы аб адлічэньні процантаў з пэнсіі, аб афіраваньнях.

Адразу-ж ЦК МОПР'у утварыў спэцыяльны фонд дапамогі палітзьняволеным і галадуючым сялянам Зах. Бел.

У гэтай кампаніі ўдзельнічалі розныя дабраахвотныя і грамадзкія арганізацыі (жаночыя камітэты, камітэты сялянскае ўзаемадапамогі і інш.). Задачы кампаніі хутка былі падхоплены ўсім пралетарыятам і сялянствам Беларусі.

За час кампаніі адбылося звыш 300 сходаў, у якіх удзельнічала звыш 300000 працоўных. У Мазыры ў часе кірмашу сяляне стыхійна арганізавалі масавую дэманстрацыю і тут-жа распачалі збор на карысьць заходніх братоў натурай. Ссылалі збожжа, складалі грошы.

Гэта не адзіны факт.

Тав. Паноў прынёў шэраг падобных прыкладаў.

У адным з менскіх дзіцячых садоў дзеці адмовіліся ад абеду, каб грошы ад гэтага перавесьці на дапамогу сваім галадуючым тварышом.

Вось якая моцная аднадумнасьць у пралетарскіх дзяцей.

Вялікую працу правялі жаночыя камітэты, якія ў шэрагу гарадоў наладзілі скарбоначныя зборы, збор сродкаў адбываўся і па кватэрных т-вах па якіх сабрана 2000 руб.

Тав. Паноў у канцы сваей інфармацыі адзначыў, што ўсяго на карысьць братоў Зах. Беларусі сабрана **69.000 рублёй.**

Менскі.

Гарсавет у барацьбе з жыльлёвым крызісам.

Строгі вучот 30 проц. нормы ў прыватных дамох.—10 проц. жылой плошчы з дамоў жыльлёвай каапэрацыі паступіць на вучот камгасу.—Наркаматы асвабодзяць 624 кв. саж. жылой плошчы.

На апошнім пасяджэньні Менскага гарсавету вялікія спрэчкі выклікала пытаньне аб кватэрным крызісе ў Менску. 30 процантная норма жылой плошчы ў прыватных дамох да гэтага часу ня была належным чынам скарыстана. Вельмі часта гэту плошчу займалі жыльцы, якіх аддзел камунальнай гаспадаркі туды не пасылаў. Пасяляліся яны ці па згодзе са старым жыльцом адналеднай кватэры, ці на згодзе з дамаўласьнікам.

Што датычыцца дамоў жыльлёвай каапэрацыі, дык тут таксама ёсьць некаторыя недарэчнасьці. Да гэтага часу, напрыклад, аддзел камунальнай гаспадаркі ў гэтых дамох ня меў ніводнага сажня жылой плошчы.

Згодна існуючых законаў, жыльлёвая каапэрацыя давала 15 проц. жылой плошчы непрацоўнаму элемэнту.

Некаторыя савецкія ўстановы разьмясьціліся вельмі, раскошна. Ёсьць выпадкі, калі пасьля рацыяналізацыі і скарачэньня апарату ўстановы ня толькі ня зьменшылі, а наадварот, напырылі свае памяшканьні.

Абмеркаваўшы гэтыя пытаньні, Менскі гарсавет пастанавіў дагаварыцца з Белжылсаюзам аб тым, каб у аддзел камунальнай гаспадаркі было перададзена 10 проц. жылой плошчы з дамоў жыльлёвай каапэрацыі.

Апроч гэтага, пастаноўлена апрацаваць праэкт абавязковай пастановы аб тым, каб усе жыльцы, якія займаюць 30-ціпроцантную ному ў прыватных дамох, пакідаючы свае кватэры, паведамлялі аб гэтым тэрмінова ў жыльлёвы стол аддзелу камунальнай гаспадаркі.

Ранейшая пастанова аб водпуску 15 проц. жылой плошчы ў дамах ЖАКТ-аў для непрацоўнага элемэнту касуецца.

Гарсавет запрапанаваў наступным установам пацясьніцца і асвабадзіць кватэры пад жылыя памяшканьні.

НК Асьветы павінен асьвабадзіць будынак і перадаць яго НК Працы, а памяшканьне апошняга павінна быць перададзена Лясному Інстытуту.

НК Земляробства павінен асвабадзіць будынак № 71 па Савецкай вуліцы пад жылыя памяшканьні.

НК Грашовых Спраў павінен асвабадзіць памяшканьне былога кантрольнага кіраўніцтва і флігель у панадворку пад жылыя памяшканьні.

НК Сацыяльнай Забясьпекі павінен перасяліцца ў свой акруговы аддзел, а будынак перадаць пад клюб імя «Розы Люксэмбург», памяшканьне апошняга павінна быць перададзена Менскай Біржы Працы.

Яўрэйская студыя («Чырвоная Заля») павінна перасяліцца ў клюб працаўнікоў зямлі і лесу, а памяшканьне тэатру перадаецца клюбу імя Леніна (гасьцініца «Эўропа»).

Польпэдтэхнікум (Савецкая 14) і яго інтэрнат (Сьвярдлоўская 38), павінен перасяліцца ў дзіцячы дом імя Чарвякова, прычым памяшканьне інтэрнату польпэдтэхнікуму будзе скарыстана пад жылыя памяшканьні.

Усім гэтым установам пасланы адпаведныя паведамленьні.

Усяго ад перамяшчэньня і пацясненьня ўстаноў атрымаецца 623,94 квадр. саж. жылой плошчы. С. А.

СУД.

ПРАЦЭС МЕНСКІХ „МЫТНІКАЎ“.

БРАЎ ЦІ НЯ БРАЎ?

Учора на раніцнім пасяджэньні суд дапрасіў Варажэйкіна.

У сваіх паказаньнях Варажэйкін кожную хвіліну сынаў словамі: гіпноз, шантаж, паклёп. Першыя хвіліны нават цяжка было зразумець, у чым справа, толькі пасьля высьветлілася, што гэта Варажэйкін гаворыць аб сваіх саварацэсьніках.

Бачыце, гэта яны на яго і паклёп і шантаж і нават гіпноз (!) навялі. Сам-жа ён чалавек сьмірны, ціхі чалавек. Ніколі ні ад каго нічога не атрымліваў, нікому нічога не даваў. Адным словам, бяз віны вінаваты.

Хто-жа такі Варажэйкін?

А вось паслухайце самі.

— Так, я чыноўнік. Мытны чыноўнік. Гэтага я не хачу адмаўляць.

У Менскай мытніцы працую з 1922 году кантралёрам. Пасада, як бачыце, невялікая, неадказная.

Гэта, бачыце, кантралёр, па думцы Варажэйкіна, не адказная пасада.

У сваіх паказаньнях Варажэйкін увесь час блытаецца. Цяжка зразумець, дзе пачатак і дзе канец яго думак.

Гаворыць напрыклад, аб сваіх адносінах да Зыкава і раптам пераходзіць да Данцова, тут-жа прыплятае сваю дачку Вольгу, якая жыве ў Растове.

Варажэйкіна абвіняюць ў тым, што ён браў хабары ад „спецаў“ за свой кантроль.

Варажэйкін, зразумела, не прызнае сябе вінаватым.

Дзе там хабары? Я нават і звыш нормавых не атрымліваў—зазяляе ён.

Толкам аб сваёй дзейнасьці Варажэйкін расказаць ня можа, і старшыні суду т. Несьцеру ўвесь час прыходзіцца прыпыняць падсуднага, прасіць каб гаварыў талькі пра тое, што адносіцца да справы.

Пасьля просьбы старшыні суда, Варажэйкін зноў пераходзіць да „аналізу“ сваёй дзейнасьці, зводзячы да аднаго:

Хабароў ня браў.

Але пытаньне—браў ці ня браў.

Ян. С.

„ЗВЫШНОРМАВЫЯ“.

На вячэрнім пасяджэньні 5 жніўня суд пачаў дапрос падсуднага Бранавіцкага. Апошні начаў свае паказаньні з палітыкі савецкае ўлады ў адносінах да мытнай справы. Далей Бранавіцкі дэтальна закрануў тэхніку мытнай працы, як яна выглядае з тэарэтычнага і як з практычнага боку.

У даваенныя часы Бранавіцкі быў сакратаром Варшаўскае мытнае акругі. Ён—мытны спец. Усе артыкулы мытных устаноў ён носіць у галаве і тут, перад судом, Бранавіцкі прачытаў надзвычайна добрую 3-х гадзінную лекцыю аб тэорыі, практыцы і аб тэхніцы мытнае працы.

Бранавіцкі абвінавачваецца ў тым, што ён ведаў аб злачынствах менскіх „мытнікаў“ і ня чыніў належных крокаў да спыненьня іх. Апроч гэтага, што Бранавіцкі браў хабары ад Данцова і Зыкава, якім давала фірма «Палатайн».

Бранавіцкі кажа, што Данцоў даў яму адзін раз 70 руб. кажучы, што гэта ад фірмы «Палатайн» за тое, што ён, Бранавіцкі, працаваў часам не ў гадзіны занятнаў. Гэтыя грошы Бранавіцкі прынаў і пачаў падгатаўляць грунт да легалізацыі звышнормавых ва ўсіх беларускіх мытніцах, чаго і дабіўся. А 70 р. ўсё-ж ён вярнуў Данцову.

Быў выпадак, калі Бранавіцкі заўважыў непарадкі на менскай мытніцы па агляду пасылак з сахарынаю. Тады ён, як намесьнік начальніка мытнае акругі, загадаў кантралёру Ануфрыеву праверыць гэта. Апошні не хацеў правяраць і казаў, што баіцца, каб Зыкаў не прагнаў яго за гэта з пасады. Быў выпадак, калі, па ініцыятыве Бранавіцкага, у Зыкава была зроблена яшчэ адна праверка і знойдзены недахопы.

Грошы, якія ён атрымаў ад Данцова, а таксама 40 руб. савецкімі знакамі, якія яму даў Зыкаў—ён лічыць законнаю звышнормаваю аплатаю.

Бранавіцкі дзвёў шэрагам фактаў, што Зыкаў настройваў мытных супрацоўнікаў супроць яго і ўсе мытнае акругі ў цэлым.

С. Азерскі.

Да ўвагі Белдзяржкіно і Г. Р. К.

(Аб пастаноўцы фільм).

Калі прафсаюзныя органы пачынаюць прыглядацца да працы кіно ў рабочых клюбах, дык яны, адмячаючы значэньне кіно ў клюбах, посьпех таго ці іншага клюбу ў справе падбору лепшых фільм, заўсёды адмячаюць таксама і тое, што кіно-праца ў нас праходзіць пеяк шаблённа: адкруціў дый годзе. З свайго боку яны прапануюць, каб перад паказаньнем фільмы праводзіўся маленькі рэфэрат, у якім згодна са зьместам фільмы неабходна абмаляваць яго зьмест, сутнасьць і г. д.

Усё гэта добра. Са ўсім гэтым згодны клюбныя працаўнікі. Але яны спасылаюцца на тое, што да пастаноўкі фільмы яны ня ведаюць яго сюжэту, зьместу і г. д. Адсюль—немагчымасьць рэфэраваньня фільм. Рэцэнзіі-ж у газэтах бываюць часта занадта сухія, панярхоўныя, а то выяўляюць толькі асабісты погляд аўтара даннае рэцэнзіі.

Вось, каб дапамагчы клюбным прапаўнікам у працы па лепшым абслугоўваньні кіно рабочай масы, трэ' было-б Белдзяржкіно, супольна з Галоўрэпэртакомам, дадаваць да фільмы аб'ектыўную рэцэнзію на яе, якую лёгка даць пасьля грамадзкага прагляду Гэта як раз быў бы выхад са становішча.

Хв. Шынкар.

ХРОНІКА.

Мэханізуем здабываньне торфу.

На Ясеньскіх балотах (Бабр. акруг.) сёлета мае быць пабудован вялікі завод, на якім здабываньне торфу будзе мэханізана. Ясеньскія балоты—адны з буйнейшых у акрузе.

8 новых польскіх с.-г. школ.

На тэрыторыі БССР сёлета ўтвараецца 8 новых польскіх сельска-гаспадарчых школ. Дзьве школы з гэтага ліку адчыняюцца ў Менскай акрузе.

Курсы ліквідатараў няпісьменнасьці.

Заканчваюць працу ўсебеларускія курсы ліквідатараў няпісьменнасьці. Курсы выпускаюць 60 чалавек. Гомельскія курсы ліквідатараў няпісьменнасьці выпускаюць 27 чалавек.

Новыя латыскія чырвоныя гурткі.

Сёлета ў латыскіх раёнах БССР арганізуецца 17 новых чырвоных латыскіх гурткоў.

Гурткі будуць поўнасьцю забясьпечаны патрэбнымі сродкамі.

Фізкультура.

Фізычная падрыхтоўка ў школе міліцыі.

У Беларускай школе малодшага каманднага складу міліцыі фізычная падрыхтоўка ўведзена з 1924 году. Заняткі падзяляюцца на 2 часткі: абавязковыя (агульная падрыхтоўка), якія праводзяцца кожны дзень, і спэцыяльныя—3 разы ў тыдзень. У праграме спэцыяльных заняткаў галоўнае месца займаюць спосабы абароны і нападу (барба, бокс джыў — джытсу і фехтаваньне), што вельмі важна для працаўнікоў міліцыі.

Усе курсанты з вялікай зацікаўленасьцю праходзяць фізычную падрыхтоўку як практычна, так і тэарэтычна. Скончыўшыя школу міліцыянэры ня толькі будуць самі фізычна разьвіты, але і зьявяцца правадніками фізкультуры на мясцох. М.

Фізкультура на курсах падрыхтоўкі настаўнікаў.

На курсах падрыхтоўкі школьных настаўнікоў, якія праводзіць Нар. Кам. Працы, 40 гадзін займае фізкультура. Заняткі вядуцца па спэцыяльнай праграме. Па скончаньні курсаў настаўнікі змогуць самастойна праводзіць заняткі па фізкультуры ў школах.

Трэба толькі паклапаціцца, каму належыць, аб выданьні адпаведных падручнікаў па фізвыхаваньні на беларускай мове, якіх да гэтага часу няма і ў якіх адчуваецца вялікая патрэба. Настаўнік.

Апавяшчэньне.

— У нядзелю, 7-VIII, а 6-ай гадзіне ўвечары адбудзецца агульны сход тэхнічных працаўнікоў саюзу працасьветы гор. Менску.

Абвестка дню:

Міжнароднае становішча СССР.

Пасьля сходу—бясплатнае кіно ў садзе Працасьветы.

Рознае.

ВОШЫТЫ З БАРАНАМІ.

Маскоўскія прафэсары і вучоныя робяць у СССР цікавыя вошты з баранамі. Вошытамі прафэсара Воранава заграніцай устаноўлена, што ад перасадкі палавых органаў ад старых бараноў маладым апошнія значна хутчэй вырастаюць, пры гэтым у іх расьце надта багатая воўна і парастае шмат лою.

Адпушчаны сродкі на такія вошты ў савецкіх гаспадарках Паўночнага Каўказу, у Чарназемнай паласе і ў Аранбурскіх стэпах.

КАСА ДЗЕЛЯ АЧЫСТКІ САЖАЛАК АД ТРАВЫ.

Сажалкі і вазёры часта зарастаюць рознай водзяной расьлінай, якая гніе і забалочвае ваду.

Дзеля ачысткі вады ад гэтай расьліны ў Францыі надумана спэцыяльная каса. Яна прымаюўваецца да чаўна, і кіраваць ёй зусім проста і лёгка.

СОВЫ—НА ЗМАГАНЬНЕ З МЫШАМІ.

Нядаўна з Амэрыкі на адну з выспаў, каля Аўстраліі адпраўлена вялікая партыя соў. На гэтай выспе разьвялося надта многа мышэй, якія нішчаць на палёх збажыну так, што жыць там амаль што нельга. Раней туды завезлі шмат катоў, але яны ня справіліся з мышамі. Зараз рашылі катоў замяніць совамі.

ЦІ ПЛАЧА ЖЫВЁЛА?

Вучоныя зрабілі шэраг досьледаў жывёлы, каб выявіць іхную плаксівасьць. Устаноўлена, што шмат якая жывёла плача ад гора.

Напрыклад, самкі аленяў плачуць, страціўшы дзяцей, мядзьведзь—пачуўшы сьмерць, слонь—папаўшыся ў пастку і г. д.

ЯК ПАЗНАЦЬ ХАРАКТАР ЧАЛАВЕКА ПА ПІСЬМУ.

Што гаворыць сучасная графалёгія?

Графалёгія, ці навука адгадваньня характару па пісьму чалавека, вельмі цікавіць многіх. Шмат для каго яна пакрыта таемнасьцю і стаіць у адным раду з варажбою на карты, або слуханьнем, што скажа ходзячы столік. Тым часам, гэта справа паўная і даступная кожнаму, хто захоча ёю сур'ёзна заняцца.

Не падлягае сумненьню, што характар пісьма знаходзіцца ў цесным сувязі з характарам чалавека і што пэўныя рысы пісьма, якія паўтараюцца, зьяўляюцца адбіткам акрэсьленых рысак характару.

Вылічым тут важнейшыя рысы пісьма, характэрныя для пэўных індывідаў.

Сіла волі выяўляецца ў рознамерным прыцісканьні пяра, дзеля чаго грубасьць паасобных літар заўсёды адпольказная. Для людзей з сільнай воляй характэрны роўным чынам завостраныя літары.

Вытрываласьць выяўляецца ў стараньні замыкаць вузлікамі літары.

Лагоднасьць—у літарах з закругленьнямі досыць дужых разьмераў.

Ашчаднасьць можна пазнаць па дробных, цесна пастаўленых літарах, звычайна вострa закончаных.

Скромнасьць. Для гэтых людзей характэрна пісаньне нізкімі, вельмі пахілымі літаркамі.

Пустата выяўляецца ў аздобных з выкрутасамі літарах. Пісьмо звычайна простае.

Шчырасьць. Шчырыя людзі маюць выразнае, чытэльнае пісьмо; «о» і «а» звычайна ў гары адкрыта.

Даверчывасьць характарызуюць літары, якія па меры зблiжэньня к канцу ўсё павялічваюцца. Гэта часта мы спатыкаем у дзяцей.

Нэрвовасьць. Нэрвовыя ці здэнэрваваныя маюць літары ня роўнай вялічыні, нячытэльныя.

Дэспатызм выяўляецца ў доўгіх канчках пры «у» «д» і j, таксама ў тэндэнцыі падкрэсьліваць важнейшыя выразы.

Расьціданасьць адзначаецца высокімі ляжачымі літарамі; 6 літар чалавека раскіданага займае столькі месца, сколькі 16 скупога.

Удумёнасьць выяўляецца ў высокіх, пэўных літарах з закругленымі лініямі.

Скрытнасьць. Літары вынягваюцца адным шнурочкам уздоўж лініі. Пісьмо выключна нячытэльнае.

Перавага розуму над сэрцам бывае ў асоб, якія маюць простае, роўнае, досыць высокае пісьмо. Апроч таго, кожная дробязь ёсьць характэрнай. Напрыклад, спосаб стаўленьня кропкі над „і“. Кропка з правага боку літары азначае шыбкае думаньне. Кропка з левага боку—павольнае, кропка высока над літарай—натура ідэалістычная.

Кропка нізка над „і“—матар'яліст. Кропка ў форме коскі—жывасьць.

Вось жменька ўваг з галіны графалёгіі, якія ў навуцы знаходзяць сваё паважнае абаснаваньне.

Пастановы і загады ўраду БССР.

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Вык. Камітэту і Савету Нар. Камісараў БССР

аб каапэрацыйных саветах.

У разьвіцьцё пастановы Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Саюзу ССР за 12 ліпеня 1926 г. „Аб каапэрацыйных саветах“ (З. З. СССР 1926 г., № 46, арт. 337) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. У БССР можа быць утвораны Беларускі Цэнтральны Каапэрацыйны Савет, а таксама акруговы каапэрацыйныя саветы з райёнам дзейнасьці ня менш аднае акругі. У Беларускі Цэнтральны Каапэрацыйны Савет могуць уваходзіць рэспубліканскія цэнтры каапэрацыі ўсіх відаў, а ў акруговыя каапэрацыйныя саветы—ніжэйшыя аб'яднаньні каапэрацыі ўсіх відаў.

2. Статут Беларускага Цэнтральнага Каапэрацыйнага Савету зацьвярджаецца Саветам Народных Камісараў, а статуты акруговых каапэрацыйных саветаў рэгіструюцца выканаўчымі камітэтамі ў двухтыднёвы тэрмін ад дня падачы.

3. Скаргі на пастановы акруговых выканаўчых камітэтаў аб рэгістрацыі і аб адхіленьні рэгістрацыі падаюцца ўстановамі і зацікаўленымі арганізацыямі ў Савет Народных Камісараў у двухтыднёвы тэрмін ад дня атрыманьня паведамленьня аб адхіленьні альбо зьвестак аб рэгістрацыі.

4. Зьмены ў статутах акруговых каапэрацыйных саветаў рэгіструюцца ў такім самым парадку, як самыя статуты.

5. Беларускі Цэнтральны Каапэрацыйны Савет мае права ўносіць у Савет Народных Камісараў праэкты законаў аб каапэрацыі, з таксама зьвяртацца з хадайніцтвамі ўва ўсе дзяржаўныя ўстановы БССР.

Старшыня Беларускага Цэнтральнага Каапэрацыйнага Савету мае права прысутнічаць на пасяджэньнях Савету Народных Камісараў БССР з дарадчым голасам.

6. Старшыні акруговых каапэрацыйных саветаў маюць права прысутнічаць на пасяджэньнях адпаведнага акруговага выканаўчага камітэту з дарадчым голасам.

7. Сродкі каапэрацыйных саветаў складаюцца з узносаў іх членаў і з іншых паступленьняў. Размер узносаў устанаўляецца пастановамі саветаў паводле статутаў.

8. Саветы ліквідуюцца пастановамі іх пленумаў альбо Савету Народных Камісараў.

Пастанова Беларускага Цэнтральнага Каапэрацыйнага Савету аб самаліквідацыі зацьвярджаецца Саветам Народных Камісараў, а пастановы акруговых каапэрацыйных саветаў—акруговымі выканаўчымі камітэтамі.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

2 ліпеня 1927 г.
г. Менск.

Постановление

Центрального Исполн. Комитета и Совета Нар. Комиссаров БССР

о кооперативных советах.

В развитие постановления Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров Союза ССР от 12 июля 1926 г. „Об кооперативных советах“ (Соб. Зак. СССР 1926 г., № 46, ст. 337) Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют:

1. В БССР может быть создан Белорусский Центральный Кооперативный Совет, а также окружные кооперативные советы с районом деятельности не меньше одного округа. В Белорусский Центральный Кооперативный Совет могут входить республиканские центры кооперации всех видов, а в окружные кооперативные советы—низовые об'единения кооперации всех видов.

2. Устав Белорусского Центрального Кооперативного Совета утверждается Советом Народных Комиссаров, а уставы окружных кооперативных советов региструются окружными исполнительными комитетами в 2-х недельный срок со дня подачи.

3. Жалобы на постановления окружных исполнительных комитетов о регистрации и об отклонении регистрации подаются учреждениями и заинтересованными организациями в Совет Народных Комиссаров в 2-х недельный срок со дня получения извещения об отклонении или сведений о регистрации.

4. Изменения в уставах окружных кооперативных советов регистрируются в том же порядке, что и уставы.

5. Белорусский Центральный Кооперативный Совет имеет право вносить в Совет Народных Комиссаров проекты законов о кооперации, а также обращаться с ходатайствами во все государственные учреждения БССР.

Председатель Белорусского Центрального Кооперативного Совета имеет право присутствовать на заседаниях Совета Народных Комиссаров БССР с совещательным голосом.

6. Председатели окружных кооперативных советов имеют право присутствовать на заседаниях соответствующего окружного исполнительного комитета с совещательным голосом.

7. Средства кооперативных советов составляются из взносов их членов и других поступлений. Размер взносов устанавливается постановлениями советов согласно уставов.

8. Советы ликвидируются постановлениями их пленумов или Совета Народных Комиссаров.

Постановление Белорусского Центрального Кооперативного Совета о самоликвидации утверждается Советом Народных Комиссаров, а постановления окружных кооперативных советов—окружными исполнительными комитетами.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. ЧЕРВЯКОВ.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. ГОЛОДЕД.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. ХАЦКЕВИЧ.

2 июля 1927 года
г. Минск.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

Да прыёму ў Беларускі дзярж. муз. тэхнікум.

У наступным навучальным годзе адбудзецца прыём у гэткія клясы: скрыпкі, віяланчэлі, кантрабаса, раяля, сольнага і харавога пяяньня, тэорыі кампазіцыі. (па духавых інструментах) трубы, валторны, цугтрамбон—туба, кларнэта, флейты, габоя і фагота.

Усяго ў тэхнікум будзе прынята 65 асоб, колькасьць стыпэндый будзе павялічана.

З наступнага году пры тэхнікуме адчыняецца інструктарская кляса, якая будзе падрыхтоўваць выкладчыкаў, інструктароў і кіраўнікоў па музыцы ў школах як музычных, так і агульна-адукацыйных, а таксама гурткаводаў для клюбаў і драматычнай, якая будзе падрыхтоўваць артыстаў.

У кастрычніку сёл. году будуць адчынены пры тэхнікуме „народныя клясы“ балалайкі мандаліны, гітары і г. д.

Заявы ў музтэхнікум ва ўсе клясы, апрача „народных клясаў“, прымаюцца да 20 жніўня; прыёмныя выпыты пачнуцца 5 верасьня. Б. Ф.

ПАДПІШЭЦЕСЯ СВАЯЧАСОВА
НА ГАЗЭТУ
„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“
на ЖНІВЕНЬ месяц
ПАДПІСНАЯ ЦАНА:
На 1 месяц — — 70 к. На 3 месяцы 2 р. —
» 2 » 1 р. 40 » Да канца году 3 р. 40 к.
За дадатковыя 40 кап. у месяц кожны падпішчык можа атрымаць часопісь «Маладняк»—кніжку ў 6 друкаваных аркушаў (100 стар.), якая даецца, як платны дадатак да газэты.
Газэта «Савецкая Беларусь» разам з часопісьсю «Маладняк» — 1 руб. 10 кап. у месяц.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: у Менску—у канторы газэты—рог вуліц Ленінскай і К. Маркса, у правінцыі—ва ўпаўнаважаных канторы і ўсімі паштова-тэлеграфнымі аддзяленьнямі і адд. Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

ТЭАТР-ЦЫРК-КІНО

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.
Гастролі артыстаў Ленінградзкага Акадэмічнага б. Александрынскага тэатру.
Субота, 6-га жніўня.
„СТРАСЬ“ („Любовь Анны Пиглер“).
П'еса Мільлера.
Нядзеля, 7 жніўня.
ОТЕЦ И ДЕТИ. Кам. Г. БАРА.
Пачатак а 8 з палов. гадз. веч.

ЦЫРК пад маст. кіраўніцтвам А. Г. КІССО.
Субота, 6 жніўня.
Цыркавое прадстаўленьне. Гастролі заменшага атракцыёна ілюзіяніста М-ч ФРАНКФОРДА. Акорды пумар: ЧАЛАВЕК У ПАСУДЗЕ ПАД ВАДОЙ. Апошнія гастролі любімцаў публікі бр. БІБ-БОБ.
Працяг чэмпіянату французкае барбы.
● 1-я пара—ВАСЯ БУРАВОЙ супр. „МАСКИ ДИНАМО“; ● 2-я пара—А. ЦІТАЎ супр. ГР. РУСАКОВА; ● 3-я пара—А. МАШТАНСКІ супр. ЗБЫШКО-СТАНКЕВІЧА; ● 4-я пара—АРЛОЎ супр. А. НОРКІНА; ● 5-я пара—ГАПОНАЎ супр. ФЕДЗІ КАЖАМЯКІ.
Нядзеля, 7 жніўня.
Сьвяточнае прадстаўленьне. Гастролі выдатнага ілюзіяніста М-р ФРАНКФОРДА. Сёньня апошні раз сусьветная сэнсацыя: ЧАЛАВЕК У ПАСУДЗЕ ПАД ВАДОЙ. Апошнія гастролі любімцаў публікі бр. БІБ-БОБ.
Працяг чэмпіянату барбы. Боруцца наступныя пары:
● 1-я пара—рашучая схватка двух мацнейшых барцоў чэмпіянату—ФЕДЗЯ КАЖАМЯКА супр. ВАСІ БУРАВОГА; ● 2-я пара—рашучая схватка—ГР. РУСАКОЎ супр. „МАСКИ ДИНАМО“; ● 3-я пара—В. МАШТАНСКІ супр. ЯРОША; ● 4-я пара—ГАПОНАЎ супр. НОРКІНА; ● 5-я пара—роваш-барба—А. АРЛОЎ супр. КОЛІ КВАРЫАНІ.
Пачатак роўна а 9 гадз. веч., барбы—у 11 г. веч. Цэны—ад 25 к.
Адміністратар Н. НІКОЛЬ.

Кіно-тэатр «КУЛЬТУРА». Сусьветны баявік вып. 1927 г. вытворчасьці «СОВКИНО» „ДЕКАБРИСТЫ“. Маст.-гістарычная фільма ў 7 частк. к пралёгам.

КІНО «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА». З аўторка, 2-га жніўня— Арыгінальная камэдыя вытворчасьці «Межрабпом-Русь» „ДЕВУШКА С КОРОБКОЙ“. У 6 частках. Звыш праграмы—хроніка Савкіно, прысьвечаная «Тыдню Абароны».

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». З аўторка, 2-га жніўня— Новая амэрыканская камэдыя „КУРС ЛЕЧЕНИЯ“. У 7 частках. Звыш праграмы—гастролі вакануцы расейскіх народных песень Валентыны Іванаўны Пэцітто.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА.
ВЫШЛІ З ДРУКУ НАСТУПНЫЯ КНІГІ:

У БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ:	Цана.
1. Карнілаў.—Падручнік псыхалёгіі. Стар. 158	1 р. 25 к.
2. Папоў.—Нарысы гісторыі РКП(б). Стар. 336	2 р. — к.
3. Струкоўскі.—Пчалярства. Стар. 90.	80 к.
4. Полымя № 4. Стар. 244.	1 р. 50 к.
5. Інтэрпэляцыі беларускіх паслоў у польскі сойм. Стар. XXXII—496	1 р. 25 к.
6. Чырвонаармейская чытанка ч. I (хрэстоматыя). Стар. 362	1 р. 80 к.
7. Колас.—У цікай вадзе. Стар. 90	70 к.
8. Рыкаў.—Англія і СССР. Стар. 32	12 к.
9. Крывазай пуцявінай. Збор твораў аб беларанскіх зьдзеках. Стар. 80	60 к.
10. Беравы.—Па крывавых сьлядох. Стар. 66	40 к.
У РАСЕЙСКАЙ МОВЕ:	
1. Лінскі.—„Случай в Зуле“. (Апавяданьні). Стар. 80	40 к.
У ЯЎРЭЙСКАЙ МОВЕ:	
1. Карпінскі.—„Величайшая революция в мире“. Стар. 60	40 к.
2. Яброў.—Практычная граматыка, ч. I-ая, выд. III-е перапрацаванае. Стар. 80	40 к.
У ПОЛЬСКАЙ МОВЕ:	
Праф. Мічынскі.—Рольнік узоровы. Зіма. Пад рэдакцыяй праф. Перасьвет-Солтана. Стар. 76	55 к.

2—2 Заказы прымаюцца ва ўсіх кнігарнях Б. Д. В.

КНИГИ по физкультуре, спорту, стрелковому спорту.

Дюперон.—Тренировка физкультурника 50 к. И. П. Мюллер.—Моя система—15 минут ежедневной работы для здоровья. 80 к. Пиотровский.—Эбер и его естественный метод физич. воспитания, 50 к., Н. Лысенков и Г. Синельников.—Анатомо-физиологические основы физкультуры человеч. тела. 2 руб. А. С. Золотухин и П. Н. Соколов.—Научно-врачебный контроль над физическим развитием, (в переплете). 2 руб. 25 коп. Физкультура.—Полный курс под ред. проф. Игнатьева и Романова с 123 рис 2 р. 25 к. Кутейников.—Легкая атлетика. 60 к. Ф. Борисов.—Велоспиед. 45 коп. Козлов.—Футбол, ручной мяч, баскет-бол. 35. Козлов.—Городки, русская лапта, итальянская лапта, волейбол. 30 коп. Трунин.—Физкультура летом, 40 к., И. Герд.—Игры на вольном воздухе. 1 р. 90 к. Г. Бессан.—Игры физкультурника. 75 к. С. Белопольский и Горчин.—Сборник вольных упражнений. 45 к. А. Дифр.—Спорт и физич. воспитание под наблюдением врача. 75 к. А. Жемчужников.—Водный спорт, плавание и гребля, 50 к., А. Железный.—Как научиться плавать. 22 коп. Рудницкий.—Лечение солнцем туберкулеза и друг. болезней.—1 р. Рудницкий.—Вода, воздух и солнце в лечении болезней. 80 коп. В. Алкалаев.—Стрелковый спорт. 40 коп. Филатов и Эвальд.—Определение расстояния до целей в стрелковом бою. 20 коп. Шестоперов.—Лодочный спорт. 35 к.

Заказы на все имеющиеся на рынке книги по физкультуре и спорту выполняются наложенным платежом немедленно.

Составление, пополнение и комплектование библиотек по физкультуре и спорту.

Требования и деньги (можно марками) направлять по адресу: Москва, 155, Малая Бронная, 10, помещение 3, „Книжная полка“. 2-6

5-га верасьня г. г. у Менскім Загс'е адбудзецца разгляд справы аб скасаваньні шлюбу грамадзян ХАРЫТОНАВА Уладзіміра Іларыонавіча і ХАРЫТОНАВАЙ Канстанцыі Аляксандраўны, згодна заявы першага.

КНИГИ ПО РЫБОЛОВСТВУ.

Арнольд. Общедоступное руководство по рыбоводству. 75 коп. Берг. Рыбы пресных вод, 2 руб., Проф. Н. Книпович.—Каспийское море и его промыслы—60 коп., Проф. А. Никольский—Гады и рыбы—2 руб. 50 коп., Формозов—Рыболовство—40 коп.

Заказы выполняются наложенным платежом. Требования и деньги (можно марками) направлять по адресу:

МОСКВА, 155, Малая Бронная, 10, помещение 3, „КНИЖНАЯ ПОЛКА“.

3-6.

ВСЕМ НЕОБХОДИМО ПРИОБРЕСТИ АВТОМАТИЧЕСКИЙ СЧЕТЧИК,

который без всяких знаний МОМЕНТАЛЬНО дает готовые результаты умножения, деления и вычисления процентов. Высылается немедленно по получении заказа и 50 к. За пересылку и упаковку 20 к., всего 70 к. (можно марками). Наложенным платежом высылается от 3 руб.

Заказы и деньги направлять по адресу: Москва 155, Малая Бронная, 10, помещение 3, „КНИЖНАЯ ПОЛКА“.